Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА


Штотыднёвая газета (Выходзіць з сакавіка 1990 г.) ◈ 11(67) ◈ 18 сакавіка 1992 г. ◈ Кошт 20 кап. (Па падпісцы — 10 кап.)

Мяккі знак — сімвал сапраўднага беларуса?

Стар. 2.

«Лічу сваім святым абавязкам хоць успомніць пра тых патрыётаў, якія сваімі юначымі сэрцамі засланялі Беларусь ад дзікай бальшавіцкай расправы ўжо ў пасляваенныя 1946 – 1947 гады».

Стар. 4.



Вось ужо другі месяц працуе ў Менску новая нядзельная школа. Яе арганізатары — гарадскі бацькоўскі камітэт і прадстаўнікі ўніяцкай царквы Беларусі.
НА ЗДЫМКУ: дыякан айцец Андрусь.

Фота Міхася ХАМЦА.

ПОСТУП ТЫДНЯ

НА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПРЫНЯТЫ ЗАКОНЫ «АБ КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ І ФОНДАВЫХ БІРЖАХ», «АБ ТАВАРНЫХ БІРЖАХ», «АБ АСНОВАХ МЫТНАЙ СЛУЖБЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» І ІНШ. АБРАНЫ СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ БЕАРУСІ. Ім стаў доктар юрыдычных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Аляксандр Абрамовіч.

З ПАЧАТКАМ РАБОТЫ ДЗЕВЯТАЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ БЫЛО АБ'ЯЎЛЕНА АБ СТВАРЭННІ НОВАГА ДЭПУТАЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ «БЕЛАРУСЬ». МЭТАЙ АБ'ЯДНАННЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕ КАНФРАНТАЦЫЯ З ПАРЛАМЕНЦКАЙ АПАЗІЦЫЯЙ, А ЗГУРТАВАННЕ СІЛ, ШТО АДДАЮЦЬ ПЕРАВАГУ ПЕРШ ЗА ЎСЁ ЭКАНАМІЧНЫМ ПЕРАЎТВАРЭННЯМ. У НОВАЕ ФАРМІРАВАННЕ УВАЙШЛО КАЛЯ 80 ДЭПУТАТАЎ.

З АФІЦЫЯЛЬНЫМ ВІЗІТАМ РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ НАВЕДАЎ НАМЕСНІК ФЕДЭРАЛЬНАГА КАНЦЛЕРА, МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ГЕРМАНІІ ГАНС-ДЗІТРЫХ ГЕНШЭР. У час візіту было падпісана пагадненне аб аднаўленні дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Федэратыўнай Рэспублікай Германіяй. У Менску і Берліне ў бліжэйшы час будуць адкрыты пасольствы дзвюх краін.

НАРАДА МІНІСТРАЎ УНУТРАНЫХ СПРАЎ СНД ПРАВЕДЗЕНА Ў МЕНСКУ. Яе ўдзельнікі абмеркавалі «Пагадненне аб узаемадзеяннях міністэрстваў унутраных спраў краін незалежных дзяржаў у сферы барацьбы са злачыннасцю». Разгледжана пытанне аб заснаванні каардынацыйнага органа — Савета міністраў унутраных спраў незалежных дзяржаў.

Рэформа моўнай адукацыі

У «Настаўніцкай газеце» надрукавана «Канцэпцыя моўнай адукацыі ў школах Беларусі» (праект). Першапачатковы варыянт канцэпцыі быў апублікаваны яшчэ ў 1990 годзе і абмеркаваны на пашыраным пасяджэнні калегіі Міністэрства адукацыі. Пасля гэтага праект абмяркоўваўся на рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі, на абласных і гарадскіх нарадах настаўнікаў, у абласным і гарадскім інстытутах удасканалення настаўнікаў у Менску, у рэспубліканскім Доме настаўніка. З улікам выказаных заўваг, як адзначаюць яго аўтары, праект быў дапрацаваны.

Праект складаецца з чатырох раздзелаў: «Асноўныя мэты моўнай адукацыі», «Аналіз сучаснага стану выкладання моў у школе», «Асноўныя шляхі дасягнення мэт моўнай адукацыі» і «Навучальна-метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу».



Каб убачыць усё сваімі вачамі і затым дапамагчы людзям, пабывалі ў Рэспубліцы Беларусь парламенцкія дэлегаты з Нарвегіі. Журналісты, вучоныя, урачы, якія прадстаўлялі ўсе буйныя медыцынскія арганізацыі гэтай краіны, зрабілі паездку на Гомельшчыну.

НА ЗДЫМКУ: гэта пажылая жанчына — адзіная жыхарка вёскі Барталамееўка, якая ўжо адселена.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА. (БелТА).



ВЫХОДЗІЦЬ НОВЫ ЧАСОПІС «АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ». У КОЖНЫМ З 12 ЯГО НУМАРОЎ МЯРКУЕЦЦА ДРУКАВАЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНЫ РАЗДЗЕЛ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ВЫВУЧАЕ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ. ЗАСНАВАЛЬНІКАМ ЧАСОПІСА З'ЯЎЛЯЕЦЦА БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ.



З рэдакцыйнай пошты

ТОЛЬКІ ЗМАГАННЕ!

Прапаную вашай газеце распачаць рубрыку, дзе б друкаваліся прапановы чытачоў, як на іх думку можна выйсці з нацыянальнага нігілізму. Такі своеасаблівы банк дадзеных. Друкаваць трэба ўсё, нават да дробязей. І нічога, што нейкія прапановы пададуцца рэдакцыі ці каму іншаму неістотнымі. Я лічу, што калі чалавек так думае, дык падобным чынам думае і пэўнае кола людзей у грамадстве, а значыцца трэба за думку кожнага чалавека.

Свае думкі ўроскід падаю ніжэй.

Трэба:

— Аднавіць і ўжываць разам з назваю Беларусь назву Літва.

Складваецца ўражанне, што мы пераконваем ужо адзін аднаго, што Вялікае княства Літоўскае — гэта нашая дзяржава, літвіны (ліцвіны) — нашыя продкі, а Літвой называліся нашыя землі. А што казаць тады пра касу-літоўку ды саху-літоўку?!

— Даць дызель-цягніку Менск—Вільня назву «Пагоня» — «Віціс».

— Набываючы газеты, у якіх надрукаваны матэрыялы на тэму Адраджэння, прачытаўшы іх, не спяшайцеся выкідаць, перадайце лепш суседзям па пад'ездзе. Думаю, што шмат іх нават і не ведаюць пра існаванне і вашай газеты, і «Нашай нівы», і беластоцкай «Нівы» і г. д.

— Перайсці ўсім свядомым выданням на дарэформенны правапіс, як гэта зрабіў нядаўна часопіс «Бярозка».

Кожны аркуш, кожнае слова сучасным правапісам — гэта гвалт над нашай мовай, марнатраўства паперы і дакументальнае сведчанне нашага рабскага становішча сёння.

— Ужываць паралельна з кірыліцай лацінку. Само жыццё вызначыць ёй месца і сферу ўжытку.

— Друкаваць, распаўсюджваць, расклейваць улёткі пад назваю «Беларус, любі Беларусь» са сціслым, элементарным экскурсам у гісторыю Беларусі, бо як ні смешна, але ёсць беларусы, якія не ведаюць, хто такі Францішак Скарына. Дадзеныя ва ўлётках могуць быць паралельна-параўнаўчыя. Напрыклад, пра таго ж Скарыну, які надрукаваў беларускую кнігу на паўстагоддзе раней за расійскую Фёдарава.

Улёткі, якія запрашаюць на святы, напрыклад, на 25 сакавіка, можна таксама суправаджаць гістарычнай даведкай. Можна друкаваць на іх тэксты патрыятычных народных песень.

— На суворaўскім вучылішчы і на вуліцах, названых імёнамі падобных «дзеячаў», павесіць інфармацыю пра іх «подзвігі» на Беларусі.

Напрыклад, на суворaўскім вучылішчы такі шчыт-інфармацыю можна назваць: «Беларус! Сувораў забіваў тваіх продкаў»...

— Усім нацыянальным сілам, партыям узяць шэфства над аднаўленнем Святадухаўскай царквы і ратушы ў Менску — сімвалаў нашай рэлігійнай і палітычнай незалежнасці.

— Мастакам, скарыстоўваючы сцэны, маляваць старажытныя выявы нашых мясцін, як гэта робяць у Прыбалтыцы і як зрабілі ў Віцебску.

— На тэлебачанні і радыё ўвесці штодзённую інфармацыю аб жыцці беларусаў на Браншчыне, Смаленшчыне, Пскоўшчыне, Дзвіншчыне, Віленшчыне, Беласточчыне. Для гэтага можна скарыстоўваць беларускія газеты, радыё і тэлеперадачы з гэтых мясцін. Болей увагі звяртаць на беларускую эміграцыю. Цікавіцца, як ідзе нацыянальнае адраджэнне ў іншых краінах былога СССР.

— Неяк паспрыяць пераезду на Беларусь усіх (хто захоча, вядома) свядомых беларусаў з рэспублік былога СССР.

— Патрабаваць беларускіх надпісаў на таварах і на цэнніках у крамах.

— Прыкласці ўсе намаганні, каб выдаць сапраўдны школьны падручнік па гісторыі Беларусі. Для гэтых мэтаў можна арганізаваць збор грошай. Тое самае адносна беларускага лемантара (менавіта лемантара, а не «буквара»).

— Аддаваць перавагу на рэкламу ў беларускіх газетах, на радыё і тэлебачанні тым прадпрыемствам і прадпрымальнікам, якія ўявілі ў свой ужытак беларускую мову.

Ігар ВАШКЕВІЧ.

У суполках ТБМ

Сумесна з грамадоўцамі

У памяшканні Жлобінскай раённай бібліятэкі раённая рада ТБМ імя Ф. Скарыны сумесна з мясцовай суполкай Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады правяла канферэнцыю па праблемах адраджэння беларускай культуры і мовы.

У час дыскусіі сваімі развагамі падзяліліся начальнік цэха домабудаўнічага камбіната М. Ляўкоўскі, выкладчык гісторыі Чырвонабярэжскага саўгаса-тэхнікума А. Лабачоў, настаўнік Папаратнянскай сярэдняй школы М. Ісаенка, дырэктар гарадской дзіцячай школы мастацтваў С. Борбут, вадзіцель аўтапарка № 25 В. Міранцоў, рабочы МПМК-99 А. Костусеў і іншыя.

Асноўныя спрэчкі прысутных выклікала рашэнне Жлобінскага гарвыканкама пра зацвярджэнне сеткі школ з беларускай і рускай мовамі навучання. З першага верасня 1992 года беларускамоўнымі стануць пачатковыя школы №№ 2, 3, 4, сярэднія школы №№ 5, 6, 7, 12. Але ж сярэднія школы №№ 1, 8, 9, 10, 11 і школа-інтэрнат вызначаны як рускамоўныя. Што ж, як кажуць, пяцьдзесят на пяцьдзесят?.. Праўда, што датычыць сярэдніх школ, то і з 1 верасня 1992 года большасць з іх у Жлобіне застанецца рускамоўнымі.

Мікола ШУКАНАЎ.
г. Жлобін.



Колькі ў адным зубры зайцаў

Нягледзячы на сакрэтнасць, з якой у Беларусі вядзецца падрыхтоўка да выпуску ўласных грошай, з кампетэнтных крыніц стала вядома, што ўжо распрацаваны эскізы як шматразовых купонаў, так і паўнавартаснай нацыянальнай валюты. Мяркуецца, што на купонах будуць выявы жывёл. Чым вышэй вартасць купона, тым буйнейшая і жывёла: ад вавёркі да зубра. Што да паўнавартасных грошай, то іх упрыгожаць не толькі жывёлы, але і партрэты вядомых гістарычных дзеячаў Беларусі, а на тысячнай купюры будзе выява фрагментаў Грунвальдскай бітвы.

Але!

МЯККІ ЗНАК — СІМВАЛ

На невялікі артыкул «Назад, у «залаты век» правапісу?» пайшлі водгукі — і гэта добра. Вітаю нават раззлаваных. Стараюся зразумець злосных. Ніякавата, калі некаторыя апаненты прыпісваюць менавіта мне ўсе тыя іранічныя заўвагі наконт планаў спадарства, якое распачало змаганне за «тарашкевіцу», а хутчэй — за наданне афіцыйнага статуса эталоннасці «фронтаўцы». Шкадую, што не ўтрымалася ад выпаду газета «Свабода», і не зусім разумею, чаму яе аўтар выступае ад першай асобы, а падпісваецца толькі крыптанімам — С. А. Пра свае асабістыя меркаванні наконт правапісных змен — крыху пазней. А цяпер скажу вось што: кожнаму, відаць, сваё. Напрыклад, былы настаўнік роднай мовы паэт Васіль Супрун, які ў свой час атрымаў 25 гадоў катаргі і яшчэ пяць «паражэння ў правах» за тое, што яшчэ ў 1946—1947 гадах гуртаваў моладзь на змаганне за права беларусаў «людзьмі звацца», і цяпер заняты трохі іншымі клопатамі, чымся тузаніна за Вялікі Мяккі Знак — з якога боку прыляпіць яго, скажам, да прыназоўніка «з» (дарэчы, у «Граматыцы...» Б. Тарашкевіча такой змякчальнай прылепы наогул не было).

Цікавую рэакцыю выклікаў у некаторых напамінак, што ў свой час практычна ўсе заходнееўрапейскія мовы перажылі жорсткае ўздзеянне (а не толькі культурны ўплыў) чужаземнай. «У іх свае шляхі развіцця, а ў беларускай свае,— паставіў мяне «на месца» сп. Іван Гушчын з Брэста. А потым і канчаткова прыцісную: — Ды і мовы гэтыя нават не славянскія». Словам, як у Леніна, а цяпер у расійскіх «патрыётаў» — «свой особый путь». Няхай так. Прыводзіць прыклады з гісторыі моў іншых народаў свету на гэты конт не буду. Тым больш, што саграшыў у адносінах да Азіі, і сп. Гушчын не праміну ў мяне сурова ўпікнуць — чым гэта мне «не дагадзілі пекінская плошча ды ўся Азія». Прашу пакорна прабачэння ў азіятаў, калі некаторым з іх мая фраза падалася крыўднай. А ўспомніў я Азію і пекінскую плошчу, прызнаюся, трохі з правакацыйна-такі мэтай. Аднак «памылку» маю, на жаль, не заўважылі. Плошчу знакамітую я ўставіў па дзвюх прычынах: па-першае, на ёй некалі бушавалі хунвейбіны, падбухтораныя ўладамі здзекавацца над «кансерватыўнай» інтэлігенцыяй, а потым, зусім нядаўна, камуністычныя кіраўнікі Кітая загадалі раздушыць танкамі кітайскіх студэнтаў, якія паспрабавалі патрабаваць дэмакратычных свабод. Па-другое, плошча тая ў кітайцаў пры пісьме абазначаецца іерогліфам, і ажно тры мяккія знакі ў слова Цянь-ань-мынь уставілі пры перакладзе не хто іншыя, як... расійцы. Увогуле кітайскія ўлады паспрабавалі ўдасканаліць пісьмо, замяніць нарэшце старажытныя іерогліфы на сучасны гукапіс. Але ў правінцыях неўзабаве ўсчаліся такія спрэчкі вакол таго, колькі гукаў абазначаць літарамі і якімі, што хутка стала зразумелым — рэформа пісьма можа скончыцца падзелам Кітая на паўтузіна суверэнных дзяржаў. Таму што многія рэгіёны гэтай практычна імперыі не проста вымаўляюць словы па-рознаму, а наогул, даўно маюць сваю адметную лексіку ды і культуру.

Вітаю спадара Івана Гушчына, калі ён выбірае ўсё ж шлях згоды. Свой ліст у рэдакцыю, падкрэслівае ён, «пішу, стараючыся прытрымлівацца сучаснага правапісу таму, што правапіс гэты пакуль афіцыйны». А вось па шляху далейшай «русіфікацыі», аб чым ён непакоіцца, «дзвігаць» беларускую мову, калі хто і пажадае, давядзецца надоўга, бо хутчэй за ўсё можа ўсчацца ў нас іншы працэс — англізацыі, а дакладней,— амерыканізацыі мовы. Што, дарэчы, адчуваюць на сабе мовы заходнееўрапейскія. Ужо зараз нам тэлефануюць у рэдакцыю і павучаюць, што больш правільна пісаць не «скаўтызм», а «скаўтынг».

Шлях згоды больш даспадобы і яшчэ аднаму майму апаненту — Генадзю Барсуку з Гомеля. Праўда, перад тым спадар не ўтрымаўся, каб не абвінаваціць мяне ў тым, быццам я сваім артыкулам «зганьбаваў незалежны беларускі друк, БНФ зь яго ідэяй рэформы», і напомніў: «зараз існуе некалькі выданьняў на «тарашкевіцы» — «Свабода» — 33-35 тыс. паасобнікаў, «Навіны Адраджэньня» (БНФ) — 14-16 тыс., «Бярозка» — каля 20 тыс., «Спадчына» (мяшаная) — 8 тыс. «Беларуская крыніца» — 3,5-4 тыс., шматлікія «тысячныя» газэты і літаратурныя зборнікі, прэса дыяспары ў Вольным Сьвеце, Летувы («Наша Ніва»), Эстоніі (выдавецтва «Грун-

І мне пашанцавала...

Сёння прагладаў падшыўку «Нашага слова» за мінулы год і натрапіў на пісьмо спадара Р. Туркова пад загалоўкам «Хачу, каб сын мой стаў беларусам» (№ 39(49). Яно мяне ўразіла. Чаму? Па-першае, уразіла падабенства нашых лёсаў і думак. Я таксама з былой Прапойшчыны. Там рос, а потым працаваў выкладчыкам у школе-інтэрнаце. Мяне ахапіла пачуццё радасці, што на беразе Сожа і ягоных «былых» чыстых прытоках гартуюцца людзі з падобнымі патрыятычнымі думкамі.

Я таксама выхоўваўся ў бабулі з дзядулем у вёсцы Бязуевічы. Гэта былі шчырыя, пяшчотныя, добразычлівыя беларусы. І мой бацька загінуў на фронце. І я ж, калі прыйшоў афармляць пашпарт, настойліва называў сябе беларусам (па маці). І мне пашанцавала: запісалі адразу, як пажадаў. Адданасць юначаму выбару я збярог, як ні штурхала жыццё. У свой час быў у зборнай камандзе Адэсы па боксу. Таму прапанавалі пасля арміі прыехаць у Адэсу ў медыцынскі інстытут ці ў фізкультурны ў Кіеў. Але перамагло жаданне прысвяціць працоўную дзейнасць «малой Айчыне». Закончыў інстытут фізкультуры ў Менску, 20 год выкладаў фізічную культуру і спорт. Дзесяць апошніх гадоў — трэнер па боксу, імкнуўся, каб мае юныя суайчыннікі выраслі мужнымі, здаровымі і разважлівымі. Мне зараз 50 гадоў. Адчуваю сябе няблага, бадзёры целам і духам, хоць жыццёвы шлях прайшоў не малы. Працягваю вучыцца. У тым ліку хачу дасканала авалодаць роднай мовай. Каб лепш спазнаць таямніцы беларускага слова, нават калі-нікалі адважваюся вершы пісаць. Вядома, сачу за беларускай паэзіяй.

І яшчэ. Прашу дапамагчы мне наладзіць ліставанне з Радзівонам Турковым з Чэлябінскай вобласці. Цікавы ён чалавек.

Васіль БАРБОЛІН.
г. Брэст.

«Вярніце грошы!»

Менавіта так называецца артыкул спадара Анатоля Таравюка ў камянецкай «раёнцы» «Навіны Камянеччыны». «Я выпісаў на цэлы год «Ленінец», а не «Навіны Камянеччыны». Я не хачу яе атрымліваць, таму вярніце грошы, бо падам у суд. Аўтар эмацыянальнага ліста называе І. В. Сталіна сапраўдным кіраўніком дзяржавы, а дзяржаўны беларускі сцяг — белай анучай. Як праціўга страсці, выступае спакойны допіс рэдакцыі: ветлівае тлумачэнне працэсу закрыцця падпіскі.

Новае ўжо не спыніць, вяртаюцца наша воля і годнасць. А хто не жадае, то «з сабой трэба мець квітанцыю».

Падрыхтаваў Ігар МІХНО.
«Выбранецкая інфармацыйная служба».

Чыталі?

ПАЧЫНАЮЧЫ З «ЭПОХІ» БРЭЖНЕВА



Здаецца, зусім нядаўна самавыдавецкі друк быў крамолай. Нікога за яго, праўда, не «бралі», але ж да канца жніўня мінулага года, калі стала ўжо ўсім зразумела, што путчысты праваліліся, атмасфера насцярожлівасці ў грамадстве ўсё ж захоўвалася.

І ВОСЬ настаў час, калі тыя першыя сціплыя лістоўкі (улёткі, як іх называюць «нефармалы») сталі не толькі прадметам гонару іх аўтараў, а і прадметам уважлівага вывучэння кампартыйных спецслужб. Адной з найбольш сур'ёзных спроб прааналізаваць падпольныя лісткі стаў артыкул навуковага супрацоўніка Беларускага навукова-даследчага інстытута адукацыі Юрася Лаўрыка «Беларускі самавыдавецкі друк» (газета «Кнігарня», № 7, 1991 год).

Зрабіўшы кароткі гістарычны экскурс у беларускі «самвыдат», аўтар затым даследуе эвалюцыю непадцэнзурнага друку на працягу апошніх 25 гадоў. Пра незалежныя выданні да 1965 года мы, на жаль, падкрэслівае Ю. Лаўрык, аніякіх звестак не маем. Не выключана, што яны існавалі, але былі рэдкімі і вельмі закансціраванымі. Паводле водгукаў прагрэсіўнай інтэлігенцыі, першыя матэрыялы «самвыдата» адносяцца да 1965 года. Да пачатку 1970-х гадоў такія выданні былі пераважна рускамоўнымі. Яны падзяляліся на тры жанравыя групы: а) мастацкія творы (М. Булгакаў, Б. Пастарнак); б) філасофскія працы агульначалавечага значэння (М. Бярдзяеў, С. Булгакаў); в) антысталінскія артыкулы і матэрыялы. Выключэннем з'яўляецца, мабыць, толькі рукапіс М. Ермаловіча «Па слядах аднаго міфа», які распаўсюджваўся ў машынапісных копіях.

Наступны этап (з 1971 па 1988 г.) характарызуецца з'яўленнем у рэспубліцы нацыянальных па духу выданняў. Да іх ліку можна аднесці рукапісны часопіс «Блакітны ліхтар» (1971 г.), які выпускаўся гуртам навапалачанаў (пераважна студэнтаў), што спрабавалі свае сілы ў літаратуры. Сярод выдаўцоў перыёдыкі былі, дарэчы, і вядомыя сёння маладыя пісьменнікі У. Арлоў і В. Мудроў. Часопіс не праіснаваў і двух гадоў — на пачатку 1973 г. «Ліхтар» пагасілі.

Было яшчэ некалькі самадрукаў: літаратурны часопіс «Мілавіца» (народная назва зоркі Венеры), а таксама грамадска-палітычныя выданні: газета «Аб усім, што баліць» (або «Гутаркі», 1975 г.), часопісы «Люстра дзён» і «Бурачок». Першы нумар апошняга называўся «Вітажэнец» па псеўданіму К. Каліноўскага.

Газету «Аб усім, што баліць» выдаваў філолаг і гісторык Мікалай Іванавіч Ермаловіч. Гэта быў штотыднёвік памерам ад адной да пяці старонак машынапіснага тэксту (вострапубліцыстычныя вершы, артыкулы, памфлеты), падпісаны псеўданімам «Сымон Беларус». Выходзіла газета больш за год.

Цікавым быў часопіс «Люстра дзён». Выдавала яго Беларуская Талеранцыйная Грамада. На жаль, прозвішча выдаўца або выдаўцоў высветліць не ўдалося.

«Бурачок» выдаваўся ў 1986—1988 гадах інтэлектуальнай элітай маладзёжнага адраджэнскага руху. Першапачаткова меркавалася кожны новы нумар часопіса называць псеўданімам аднаго з дзеячаў беларускага руху («Вітажэнец», «Бурачок» і інш.). Аднак у выніку таго, што другі нумар часопіса набыў вялікую папулярнасць сярод моладзі, вырашана было загаловак выдання не мяняць. Трэці нумар абмінула ўдача. Амаль увесь наклад быў арыштаваны КДБ пад час яго распаўсюджвання. Выпуск часопіса прыпыніўся.

Прыкладна з другой паловы 70-х гадоў для капіравання і множання самавыдавецкіх матэрыялаў пачынае ўжывацца ксеракс. Але наклады яшчэ рэдка перавышаюць 10—20 экземпляраў. На гэтым фоне стварэнне ста копій з «Расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка» В. Ластоўскага ў 1980 годзе навапалацкім нацыянальным асяродкам з'явілася сапраўднай падзеяй. Ксеракс ажывіў самавыдавецкі рух.

У 1988 годзе ў развіцці беларускага самадруку пачынаецца новы перыяд, звестунамі якога сталі «Навіны» Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне» і «Студэнцкая думка». З гэтага часу лік беларускіх непадцэнзурных выданняў пачынае няўхільна расці.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

Дзе набыць беларускія паштоўкі?

Шаноўная рэдакцыя «Нашага слова»! Мне трэба было набыць беларускі каляндар, але нідзе ў Менску я не змог яго знайсці. Адзін мой былы сусед, які цяпер жыве ў Злучаных Штатах Амерыкі, звярнуўся да мяне з просьбай даслаць яму некалькі беларускіх каляндарыкаў і паштовак. Я яшчэ раз абышоў шмат кіёскаў і кнігарняў, але іх так і не знайшоў.

Можа, Вы ведаеце, дык падкажыце, дзе ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь знайсці беларускія каляндарыкі і паштоўкі? Ці, можа, гэта наогул неіснуючая ў прыродзе з'ява? Тады чаму не выконваецца Закон аб мовах і да якога часу беларусы на Беларусі будуць цярпець ад дыскрымінацыі?

Васіль РЫЧЫК.
г. Менск.

Галоўны мастак выдавецтва «Беларусь» Генадзь Іванавіч Мацур паведаміў, што, пачынаючы з мінулага года, група мастакоў інтэнсіўна працуе над эскізамі беларускіх паштовак. Ужо ў 1991 годзе паступілі ў гандаль беларускія віншавальныя паштоўкі і паштоўкі з выявай нацыянальнай сімволікі, у прыватнасці «Пагоні», а таксама камплект «Гродна на старых паштоўках». Вядзецца распрацоўка эскізаў новых паштовах — віншавальных і з нагоды розных свят — Калядаў, Новага года, Вялікадня, Дзядаў, 8 Сакавіка, дня нараджэння і інш.

Далей Генадзь Іванавіч падкрэсліў, што яны зацікаўлены выдаваць нацыянальныя паштоўкі вялікімі тыражамі ад 50 да 100 тысяч. Але на самай справе тыраж не перавышае і 5 тысяч. Прычын некалькі. Адна з іх — адсутнасць якаснай паперы, што паступала ў асноўным з Фінляндыі. Цяпер даводзіцца выкарыстоўваць старыя запасы, а таксама купляць паперу па высокіх цэнах на біржах і ў кааператараў. Другая прычына — незацікаўленасць упраўлення кніжнага гандлю «Белкніга» ў распаўсюджванні нацыянальных паштовак. Экспертыза (часта ў асобе аднаго чалавека) вырашае, што паштоўкі купляцца не будуць, і тыраж памяншаецца з 50 да 5 тысяч.

Што тычыцца беларускіх календароў, то Генадзь Іванавіч адзначыў: у мінулым годзе выйшаў адрыўны каляндар на 1992 год «Родны край». У ім змешчана інфармацыя пра важнейшыя даты і падзеі, звесткі пра гісторыю, культуру і народную гаспадарку Беларусі, карысныя парады па вядзенні хатняй гаспадаркі і выхаванні дзяцей. Выйшаў таксама насценны каляндар «Беларускія абразы» на 1992 год, які змяшчае рэпрадукцыі абразоў беларускіх майстроў розных стагоддзяў. Плануецца выхад «Беларускага народнага календара» на 1993 год (складальнік І. А. Васілевіч, мастак Ю. П. Герасіменка). Нацыянальныя абрады, звычаі, прыкметы, павер'і, прыказкі складуць змест гэтага насценнага календара з 12 аркушаў. Выдавецтва «Беларусь», дарэчы, мае ў Менску кнігарню ў падземным пераходзе на станцыі метро «Плошча Перамогі», дзе можна набыць беларускія паштоўкі і календары.

Л. БАРШЧЭЎСКАЯ.

Але!

САПРАЎДНАГА БЕЛАРУСА?

вальд»)».

Усё так, але ці варта чытачоў гэтых выданняў татальна залічваць у аматары «фронтаўкі»? Дарэчы, я ж таксама выпісваю ці рэгулярна купляю іх у кіёсках. А калі яны толькі пачыналіся, пастаянна перадаваў чырвонцы і болей для іх фінансавай падтрымкі з не такіх ужо і вялікіх сваіх заробкаў. Гэтак жа рабілі некаторыя іншыя пісьменнікі — Янка Брыль, напрыклад, Віктар Карамазаў, Павел Місько, Уладзімір Дамашэвіч і шэраг яшчэ, хто не пісаў і не збіраецца пісаць «фронтаўкай». Проста не змогуць, калі іх нават нейкім чынам, не прывядзі Гасподзь, прымусяць. Ці адкінуць пахунвейбінаўску (ну вось, зноў Азія ўспомнілася!) прэч іх творчасць, а саміх паслаць у вёску на перавыхаванне? Не лічыцца з філіграннай прозай Янкі Брыля, Яна Скрыгана (пацярпелага, дарэчы, за «нацдэм»), раманамі Івана Мележа, сусветна вядомымі аповесцямі Васіля Быкава, паэзіяй Сяргея Грахоўскага (зноў жа — былога вязня ГУЛАГа за «нацдэм») ды і многіх яшчэ празаікаў і паэтаў? Нехта з маладых, магчыма, мяркуе, што ён асабіста ад гэтага выйграе. Але ж так некалі лічылі і тыя, хто падбухторваў расправу над «нацдэмамі». А што мы маем ад той «пралетарскай акцыі»? У тым ліку і самі завадатары «чыстак»? Генадзь Барсук, як вышэй адзначалася,— за памяркоўнасць: нават «вяртаючы дарэформенны правапіс,— піша ён,— трэба захаваць згоду зь прыхільнікамі вашае думкі». Ён — за яе пошук «на навуковых канфэрэнцыях» і за тое, што калі нешта мяняць, то «па дамоўленасці». А вось на чым стаіць цвёрда, гэта на тым, што «безумоўна «Мяккі Знак» гандлю не падлягае». Усё з вялікай літары — і ствараецца ўражанне ці не своеасаблівага «сымболя» сапраўднага беларуса. А ў падтрымку свайго меркавання прыводзіць многія радкі з паэмы «барда, сябра Сойма БНФ Сяржука Сокалава-Воюша» «Мяккі Знак», дзе гаворыцца, што бальшавікі ненавідзелі Мяккі Знак і асудзілі яго «на скон, як буржуйскага здрайцу-шпега». Прызнацца, сам люблю песні Сяржука, але ці сапраўды не карысталіся бальшавіцкія карнікі дзеля сваіх чорных спраў і «безгалосым слугою граматык»? Давайце зірнём на тэксты з беларускіх газет пачатку трыццатых гадоў. Вось некалькі выпісак, зробленых з універсітэцкай шматтыражкі «За сталінскія кадры»:

«...Рабочая кляса, узброеная Ленінскай тэорыяй, рыхтуецца да апошняга і рашучага штурму капіталістычных мураў... Толькі што скончылася чыстка нашае ячэйкі. Чыстка паказала, што мы зьяўляемся бальшавіцкі-згуртаваным калякцівам...»

З інстытуцкай шматтыражкі «Ленінец» таго ж перыяду:

«...Мы адмаўляемся ад ударных групаў, якія вылучаюцца зь агульнае масы студэнцтва, таму што ўвесь Камвуз перад тварам партыі абвяшчае сябе ўдарным у адносінах узьняцьця вытворчасьці працы, паскарэньня тэмпаў скканчэньня Камвузу...»

Спакойна выкарыстоўвала «безгалосага слугу граматык» не толькі прапагандысцкая машына, але і карныя органы непасрэдна:

«Пастанова 1930 г. жніўня 15 дня аб прыцягненьні да сьледцтва ў якасьці абвінавачваемага

...гр-на Ластоўскага Вацлава Усьцінавіча дапытаць у якасьці абвінавачваемага... прад'явіўшы абвінавачваньне ў прыналежнасьці да нелегальнай к.р. арганізацыі, г. зн. у злачынстве, прадугледжаным 76 арт. КК, аб чым аб'явіць яму пад расьпіську...»

«Выпіс
з пратаколу пасяджэньня Прэзыдыуму ЦВК Советаў Беларускай Соцыялістычнай Рэсп. ад 2.XI.—1930 г.

Пастанавілі:
хадайнічаньне ДПУ Бел. аб працягненьні тэрміну трыманьня пад вартай падсьледственных Некрашэвіча С. М., Баліцкага А., Адамовіча А., Прышчэпава Д., Цьвікевіча А. І., Ластоўскага В. У., Цьвікевіча І. І., Шлюбскага А. А., Лёсіка І. Ю., Чаржынскага В. В., Грамыку М. М., Смоліча А. А., Трамповіча П. І., Краскоўскага І. І. (цвет беларускай навукі! — Э. Я.) задаволіць»...

Нікога з іх не пакінулі жывымі. А пісалі ім смяротны прысуд яшчэ «тарашкевіцай». Выкарыстоўвалі і яе бальшавікі дзеля сваіх, як тады пісалася, «клясавых мэтаў».

А зараз вось што падумалася: ці не выкарыстоўваюць «абаронцы пралетарыяту» тое, аб чым раптам разгарэлася спрэчка, з намерам учыніць раскол у стане дэмакратаў у самы адказны перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці? У свой час агентуры КДБ, відаць, такім жа прыёмам удалося аддзяліць эмігранцкі асяродак ад «кантынентальнай» Беларусі (на што, мяркуючы па газеце «Ніва», не паддалася інтэлігенцыя Беласточчыны, у якой былі значна больш трывалыя сувязі з БССР). На такі роздум, дарэчы, наводзяць нядаўнія падзеі ў Францыі. Перад самым пачаткам вайны ў Персідскім заліве журналісты высветлілі, што некаторыя магутныя фірмы ваеннапрамысловага комплексу насуперак забароне ўрада тайна прадавалі высокаэфектыўную зброю рэжыму Садама Хусейна. А ёю могуць быць забіты французскія салдаты, якіх накіроўвалі ў зону баявых дзеянняў. Справай заняліся следчыя органы, парламент. І тады раптам у сродках масавай інфармацыі ўсчынаецца палкая дыскусія... аб удасканаленні правапісу. Газеты публікуюць спрэчкі апанентаў, роспыты насельніцтва, параўнальныя табліцы, прагнозы. У гэтым вялікім лямантце некуды на другі ці нават трэці план адышлі паведамленні аб ходзе следства па продажу зброі ў абход закону. І вось дзіва: як толькі ў Персідскім заліве баявыя дзеі скончыліся, бы па камандзе аціхлі і спрэчкі вакол правапісу, хоць сама праблема і засталася. Словам, калі хто і лічыць, што змены ў заходнееўрапейскіх мовах беларусам не ўказ, то над апошнім выпадкам усё ж варта задумацца.

А ўвогуле, бойцеся, людзі добрыя, падзелу грамадзян на «белых» і «чорных» яшчэ і па прыкмеце, хто і як прызвычаіўся пісаць ці вымаўляць словы. Калі без варажнечы, то неяк жа паразумеемся.

Эрнэст ЯЛУГІН.

Доўгі час здавалася: усякае супраціўленне дэмакратычных сіл Беларусі імперска-бальшавіцкаму рэжыму наогул скончылася яшчэ ў пачатку трыццатых гадоў, калі «дабралі» апошніх «нацдэмаў», а потым наступіла масавая пакора і магільнае маўчанне зняважаных, затурканых і абалваненых бессаромнай прапагандай «тутэйшых». Здавалася, у народзе ўжо няма больш ні моцы, ні нават малога жадання для пратэсту супроць гвалту над сабой. Але вось пачало падрастаць новае пакаленне, і — о цуд! — па Беларусі пайшла ўсхваляваная чутка: то тут, то там узнімаюць галаву «нацыяналісты», хочуць не толькі размаўляць па-беларуску, але і распусціць калгасы і наогул аддзяліцца ад сталінскага СССР. Гаварылі пра масавыя арышты моладзі ў Брэсце, Баранавічах, Маладзечне і іншых месцах, асабліва ў Заходняй Беларусі, пра суровыя прысуды трыбуналаў. Упершыню асабіста я больш-менш дакладна ведаў пра падзеі 1949—1951 гадоў. Звесткі ж пра тое, што адбылося ў 1946—1947 гадах, былі вельмі няпэўныя, афіцыйнай прапагандай гэта падавалася як барацьба супроць гітлераўскіх недабіткаў, якія не паспелі ўцячы на Захад і хаваліся ў лясах. Цяпер, калі я, дзякуючы дапамозе Зміцера Санько, стаў цікавіцца гэтым, аказалася, што амаль няма ні архіўных матэрыялаў, ні сведак. Нарэшце пра некаторых удалося даведацца, але частка з іх, аказалася, жывуць за межамі Беларусі. Тым не менш нешта назапашвалася, праўда, пераважна пра падзеі 1951 года. Звярнуўся я за падтрымкай і да дэлегатаў Устаноўчага з'езда ахвяр палітычных рэпрэсій на Беларусі, назваў свае каардынаты. І вось першы вынік — у рэдакцыю прыйшоў спадар Васіль Супрун і прынёс 7 машынапісных старонак успамінаў пра тыя даўнія трагічныя падзеі. Спадзяюся, што адгукнецца і нехта яшчэ. Буду ўдзячны за любыя звесткі: хто што чуў ці бачыў тады — можа, нешта і пра людзей, прозвішчы якіх друкуюцца ў канцы допіса.

Эрнэст ЯЛУГІН.

ПАТРЫЁТЫ МАЎЧАЦЬ НЕ СХАЦЕЛІ!

НЕАДНАРАЗОВА чуў ад моладзі балючы папрок: а чаму гэта вы, старэйшае пакаленне, пакорліва маўчалі, калі камуністычная зграя, гвалтуючы нацыянальныя святыні Беларусі, чыніла здзек над народам, культурай, мовай, гісторыяй нашай, з дзяцей робячы лютых «янычараў», здольных зубамі рваць жывое цела Маці Беларусі? Дык вось, хачу сказаць — не, маўчалі далёка не ўсе.

Сотні, тысячы лепшых сыноў і дачок народа мужна кідалі свой лёс пад крывавыя гусеніцы сталінскага Малоха з надзеяй, што на касцях нашых юначых забуксуе праклятая машына дзікай тыраніі і народ беларускі ўздыхне вальней. І браў адчай: хруст чалавечых касцей, енкі і стогны ахвяраў толькі распальвалі садызм катаў, рукі якіх і сёння да плеч у людской крыві.

Але тыя, хто шчыра і свята любіў сваю Беларусь, за волю яе, яе выратаванне ўсё роўна ішлі і ішлі на любыя мукі, ахвяроўваючы сабой. Хоць добра ведалі: супроцьстаяць узброенай да зубоў бальшавіцкай ардзе не зможам, ідзём на смерць.

І сапраўды: ацалелі адзінкі, ды і тыя абылганыя, скалечаныя, растаптаныя. Лічу сваім святым абавязкам хоць успомніць пра тых патрыётаў, якія сваімі юначымі сэрцамі засланялі Беларусь ад дзікай бальшавіцкай расправы ўжо ў пасляваенныя 1946—1947 гады.

Час быў вельмі складаны і цяжкі. Закончылася вайна з Нямеччынай і Японіяй. Усе з надзеяй чакалі волі і палітычнага паслаблення, адмены рэпрэсій. Жыццё ж сведчыла аб іншым. З дапамогай агромністай арміі кампартыйных прыблудаў і недавукаў, што нацягнуліся з Усходу, пачалася гвалтоўная русіфікацыя і наступ на ўсё беларускае: культуру, мову, гісторыю. Усе кіруючыя і адміністрацыйныя пасады апынуліся ў руках прышлых антыбеларускіх элементаў. Перспектыва на выжыванне беларускай культуры, асабліва на тэрыторыі заходняй часткі Беларусі, стала безнадзейнай і пагаршалася ўвачавідкі. Усяго гэтага не магла не заўважаць чуйная на палітычны клімат моладзь і інтэлігенцыя. Асабіста мне не было яшчэ і дваццаці гадоў. Мы, студэнты і настаўнікі, спрабавалі пратэставаць, пісалі ў газеты, у вярхоўныя органы ўлады. Але ўсе нашы намаганні зняважліва і здзекліва асмейваліся партакратыяй і пагрозліва «падшываліся» да нацыяналізму ці нават фашызму.

Моладзь вымушана была пайсці на падпольную барацьбу. Недзе ўжо на пачатку 1946 года ў розных кутках былой Заходняй Беларусі — у Слоніме, Навагрудку, Баранавічах, Глыбокім, Паставах, Брэсце і ў іншых гарадах і мястэчках зняволенай, але яшчэ не пастаўленай на калені Беларусі пачынаюць стыхійна ствараццa групоўкі, потым і арганізацыі. Я веру, гісторыкі даследуюць і раскажуць аб усім больш падрабязна. Мне ж зараз хочацца хоць каратка згадаць аб тым патрыятычным руху — як удзельніку — і назваць вядомыя мне імёны яго мужных змагароў. Скажу толькі, што многія з нас не спадзяваліся выжыць.


Вясной 1946 года была створана падпольная беларуская патрыятычная арганізацыя ў Слоніме. Для канспірацыі яе назвалі «Чайка». Заснавальнікамі-арганізатарамі яе былі пераважна маладыя настаўнікі — Міхась Ракевіч, Аляксандр Гардзейка, Міхась Чыгрын, Уладзімір Салавей, Леакадзія Кавальчук, Ніна Карач і аўтар гэтых радкоў. Адразу ж была распрацавана і прынята праграма дзейнасці арганізацыі, умовы канспірацыі, вызначаны палітычны напрамак — сацыял-дэмакратычны і абрана кіраўніцтва. Галоўнай мэтаю, якую мы перад сабой ставілі, была абарона нацыянальных правоў і свабод, барацьба за захаванне і развіццё беларускай культуры, мовы і гісторыі. Арганізацыя павінна была аб'яднаць перадавое студэнцтва, беларускую інтэлігенцыю, свядомую рабочую і сялянскую моладзь, шляхам агітацыі і прапаганды ўплываць на абуджэнне і развіццё свядомасці народа, яго нацыянальнай годнасці. Распрацоўваліся таксама і структурна-палітычныя праекты будовы незалежнай Беларусі, шляхі барацьбы за дабрабыт народа. Арганізацыя хутка расла. Згодна з умовамі канспірацыі, кожны з членаў не павінен быў ведаць больш за 6 чалавек з падполля. У сваю чаргу, кожны з удзельнікаў ствараў толькі яму вядомую групу прыхільнікаў руху.

Ужо вясной «Чайка» выйшла на падпольную, але слаба канспіраваную групу патрыётаў у Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце. Праз пэўны час, праправерыўшы надзейнасць кожнага праз студэнта У. Салаўя, кіраўніцтва «Чайкі» пайшло на аб'яднанне з імі. У пачатку чэрвеня 1946 года ў Баранавічы выехалі: М. Ракевіч, У. Салавей (як сувязны) і я. Ад Баранавіцкага падполля прадстаўнікамі для перамоў з намі былі Аляксандр Барэйка, Міхась Агейка і Аляксандр Шапавал. Пасля аб'яднання для агульнай каардынацыі руху было выбрана кіраўніцтва ў складзе трох асоб — старшыні і двух намеснікаў (В. Супрун, А. Барэйка і М. Ракевіч). Работа яшчэ больш актывізавалася. Выйшаў на падпольную групу Брэсцкага чыгуначнага тэхнікума і наваградскі падпольны «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ). Даходзілі чуткі пра існаванне патрыятычных суполак у Менску і Гродне, і мы спрабавалі наладзіць сувязь і з імі.

Навагрудская група, кіраўніком якой быў Генадзь Казак, пры бліжэйшым знаёмстве з ёю выклікала сумненні,— вельмі ўжо адкрыта дзейнічалі яе сябры, таму было вырашана пакуль устрымацца ад аб'яднання, але кантакты з ёю не парывалі. Тым не менш усцерагчыся ўсё ж не ўдалося — па нявопытнасці некаторыя сябры нашай арганізацыі без кансультацыі з кіраўніцтвам увайшлі-такі ў навагрудскую групу СВБ. А там ужо працаваў стукач з дзяржбяспекі. Аб апошнім стала вядома толькі пасля суда.

Паміж тым, летам 1946 года ўжо сфарміраваўся Цэнтр беларускага вызваленчага руху (ЦБВР). У яго склад увайшлі В. Супрун — кіраўнік, А. Барэйка, М. Ракевіч, М. Агейка, У. Салавей и М. Макарэвіч. Кожны з членаў Цэнтра меў свае абавязкі і напрамкі дзейнасці.

У канцы 1946 года пачалі актыўна дзейнічаць падпольныя групы пры Жыровіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме, Гануавіцкім педвучылішчы, а ў пачатку 1947 года рух перакінуўся таксама ў Маладзечанскую і Пінскую вобласці. З мэтай канспірацыі арганізацыйнае падполле будавалася наступным чынам. Работай кіраваў Цэнтр, вакол яго было створана так званае Першае кола падполля — гэта абласныя структуры кіравання. Кіраўнікамі па абласцях былі прызначаны: у Баранавіцкай вобласці — Аляксандр Барэйка, Брэсцкай — Мікалай Макарэвіч, Маладзечанскай — Сяргей Яноўскі, Пінскай — Мікалай Ляскавец. Ад Першага кола адыходзілі перыферыйныя групы, якія ўтваралі Другое кола — раённыя цэнтры падполля, а ад іх — Трэцяе кола. На тэрыторыі Слонімшчыны існавалі групы Трэцяга кола, якія, дзякуючы канспірацыі, не былі схоплены чэкістамі, але дзейнічаць эфектыўна ўсё ж у далейшым не змаглі.



МИНИСТЕРСТВО ВНУТРЕННИХ ДЕЛ

АХ

СПРАВКА № 091280

Мы не ведалі, што за многімі з нас ужо сачыла спецгрупа МДБ. Правяралася ліставанне і сустрэчы, вяліся пошукі людзей, вядомых стукачу па прозвішчах. Арышты пачаліся ў пачатку чэрвеня 1947 года і працягваліся да жніўня. І хоць у прыгаворах трыбуналаў значылася, што падполле рыхтавала ўзброенае паўстанне з мэтай выхаду Беларусі са складу СССР, пры арыштах і вобысках ні ў аднаго з падпольшчыкаў (як мне вядома ад следчых) зброі выяўлена не было, не зафіксавана ні адзінага крымінальнага злачынства, учыненага сябрамі падполля, тэрарыстычных актаў. Праўда, у кагосьці пры вобыску на падстрэшшы знойдзены быў штык, якім калолі свіней, і вось гэты штык пачаў фігураваць як «зброя падполля», якой мы мелі намер «закалоць» СССР.

Перад судом я пытаўся ў следчага: ці не смешна будзе чытаць калісьці аб такой узброенай контррэвалюцыі супраць СССР?

Аказваецца, не смешна, калі і цяпер Вярхоўны Суд суверэннай Рэспублікі Беларусь, што ўзнікла на руінах СССР і камуністычнага таталітарызму, дэманстратыўна падтрымлівае рашэнні берыеўскіх ваенных трыбуналаў і дадзенай яму ўладай працягвае душыць тых, хто, не шкадуючы свайго жыцця, змагаўся супраць антычалавечага рэжыму за незалежнасць Беларусі, за захаванне роднай культуры, мовы і гістарычнай спадчыны. Мне, напрыклад, 10 студзеня 1992 года ў Вярхоўным Судзе рэспублікі судовая калегія ў складзе старшыні Н. Германчука і членаў Е. Смірнова і І. Федарынчыка не толькі адмовіла ў рэабілітацыі, але і беспадстаўна змяніла рашэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР № 43 ад 7 чэрвеня 1956 года, якое мне было зачытана пры вызваленні з канцлагера ў Варкуце.

Аказваецца, мы і цяпер усе яшчэ застаёмся «ворагамі». Але каго? Катаў, чые рукі і сумленне заліты крывёй мільёнаў ахвяр, праклёны якім шлюць цяпер ацалелыя «зэкі» і сем'і замучаных?!

Што ж, гісторыя яшчэ не сказала свайго апошняга слова пра ўсё гэта. Я вельмі павярхоўна згадаў аб адной з падпольных патрыятычных беларускіх арганізацый, якія існавалі ў 1946—1947 гадах на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Мімаходзь успомніў і навагрудскі «Саюз вызвалення Беларусі», кіраўнік якога Генадзь Казак загінуў у сталінскім ГУЛАГу. На жаль, многіх з былых падпольшчыкаў ужо няма ў жывых. Імёны ж іх схаваны ў тоўстых папках архіваў КДБ і зусім невядомы суверэннай Беларусі, за вызваленне і сённяшні дзень якой патрыёты аддалі сваё жыццё. Назаву некаторых з іх. Гэта згаданы ўжо Генадзь Казак, Яўген Лішко, Майсей Стома, Адам Шабоцька, Фёдар Даўгач, Вячаслаў Краскоўскі, Аляксандр Жукоўскі і іншыя. Некаторыя з іх памерлі, ужо выйшаўшы на волю.

Самастойна, але амаль аднachасова з названымі арганізацыямі ўзнікла і патрыятычнае падполле ў гарадах Глыбокім і Паставах. Студэнты Глыбоцкага педвучылішча па ініцыятыве Васіля Мядзельца, Аляксандра Юршэвіча і Антона Фурса ў 1946 годзе заснавалі пры педвучылішчы падпольную беларускую групу, якая ставіла перад сабой мэту: будзіць патрыятычныя пачуцці сярод студэнцтва і інтэлігенцыі Беларусі, клікаць народ да змагання за волю супраць любога акупацыйнага гвалту. Бальшавіцкая акупацыя ўсё часцей стала параўноўвацца з фашыстоўскай, а палітыка Сталіна — з гітлераўскай. Асабліва рэзка кідаліся ў вочы зняважлівыя адносіны прышлых улад да культуры і мовы народа, наогул да яго духоўнасці, чаго не рабілі нават нямецкія акупанты. Моладзь — гэта палітычны барометр грамадства, які рэагуе найбольш эмацыянальна і чуйна на ўсе адхіленні ад нормы.

Тут жа аб нормах нават не магло быць і згадак. Грубасць і гвалт, разбэшчанасць і хамства пацяклі ракой разам з кампартыйным асадніцтвам і русіфікацыяй. Будучыя настаўнікі — студэнты педвучылішча — адчулі ўсё гэта сэрцам. Пратэст выліваўся ў супрацьстаянне і барацьбу.

Ужо ў канцы 1946 года глыбоцкая група патрыётаў налічвала значна больш за дзесяць чалавек і прыняла падпольную назву «Саюз беларускіх патрыётаў» (СБП). У гэты час з Пастаўскага педвучылішча прыбыў студэнт Мікола Асіненка, і высветлілася: там таксама існуе аналагічная падпольная група. Кіравалі ёю Мікола Асіненка і Валянцін Лагунёнак. Пастаўскае падполле таксама налічвала каля дзесяці сяброў. Было вырашана аб'яднацца пад адной назвай «Саюз беларускіх патрыётаў» і дзейнічаць сумесна. Акрамя асноўнай мэты, Саюз шукаў міжнароднай падтрымкі, сувязей з беларускім замежжам. Гэта выкарысталі кэдэбісты і падсунулі правакатара.

Нявопытнасць у падпольнай рабоце і канспіратыўныя прамашкі далі магчымасць чэкістам лёгка пранікнуць у пастаўскую групу, а затым і ў глыбоцкую. На працягу некалькіх месяцаў групы дзейнічалі фактычна пад наглядам чэкістаў і нават з удзелам «падсадкі», які стараўся патрыётаў як мага больш «запэцкаць», падбухторваў на правакацыі.

Арышты былі праведзены аднachасова ў двух названых раёнах Маладзечанскай вобласці (Пастаўскім і Глыбоцкім) у пачатку лютага 1947 года. Праўда, некаторым членам глыбоцкага падполля ўдалося схавацца і пражыць на нелегальным становішчы яшчэ некалькі месяцаў. Таму па гэтаму падполлю адбыліся два судовыя працэсы: першы і асноўны — у ліпені ў Менску, другі значна пазней — у Полацку.

Па Цэнтру беларускага вызваленчага руху таксама было некалькі закрытых ваенных трыбуналаў у Баранавічах і Менску.

Мне вядомы прозвішчы больш чым пяцідзесяці чалавек падпольшчыкаў 1946—1947 гадоў, якія сталі ахвярамі бальшавізму, але гэта толькі частка з таго патрыятычнага руху.

Вось іх прозвішчы:

Агейка Міхась, Адамовіч Аляксандр, Альшэўскі Кастусь, Асіненка Мікола, Асіненка Ніна, Бабіч Іван, Бабіч Марыя, Баговіч Леанід, Бароўка Алена, Барсук Алена, Барсук Ларыса, Барэйка Аляксандр, Бацяноўскі Альберт, Бялевіч Леў, Гардзейка Аляксандр, Даўгач Фёдар, Дзікі Аляксей, Ждановіч Мікалай, Жукоўскі Аляксандр, Кабак Антон, Кавальчук Леакадзія, Казак Генадзь, Казак Лявон, Капціловіч Міхась, Кернога Уладзімір, Краскоўскі Вячаслаў, Краснадубская, Лагунёнак Валянцін, Лазіцкі, Лішко Яўген, Лысенка, Ляскавец Мікола, Лях, Макарэвіч Мікалай, Мядзелец Васіль, Несцяровіч, Пачопка Мікола, Пярловіч Самсон, Ракевіч Міхась, Салавей Уладзімір, Сапежка, Сідаровіч Яўген, Спіркові Пятро, Стома Майсей, Табола Алег, Фурс Антон, Чыгрын Міхась, Шабоцька Адам, Шапавал Аляксандр, Шуман Павел, Юршэвіч Аляксандр, Яноўскі Сяргей.

Ва ўмовах канспірацыі і абмежаванай магчымасці збору больш дакладных звестак многія факты і прозвішчы засталіся невядомымі.

Васіль СУПРУН.

Вельмі прашу ганарар за артыкул «Патрыёты маўчаць нн схацелі!» накіраваць на ўзвядзенне помніка ахвярам камунізму ў Курапатах.

РАЗМОЎНІК ВЕТЛІВАГА ГОСЦЯ

Гасцяванне ў Германіі

Як ваша імя?
Wie heiβen Sie?
ві: хайсэн зі:?
Я не разумею ваша пытанне.
Ich verstehe Ihre Frage nicht.
іх фэрштэ: і:рэ фрагэ ніхт.
Гаварыце павольней (выразна)!
Sprechen Sie langsamer (deutlich)!
шпрэхен зі: лангзамэр (дойтліх)!
Мяне клічуць Мікола.
Ich heiβe Mikola.
іх хайсэ Мікола.
Вы размаўляеце па-нямецку?
Sprechen Sie deutsch?
шпрэхен зі: дойч?
Шкада, што я не гавару па-нямецку.
Wie schade, daβ ich nicht deutsch spreche.
ві: шадэ, дас іх ніхт дойч шпрэхе.
Хто тут гаворыць па-беларуску (па-нямецку)?
Wer spricht hier belorussisch (deutsch)?
вэр шпріхт хі:р белорусіш (дойч)?
Ці не можаце мне дапамагчы?
Können Sie mir helfen?
кёнэн зі: мір хелфэн?
Як (што) вы сказалі?
Wie (was) sagen Sie?
ві: (вас) заген зі:?
Мне трэба вам нешта сказаць.
Ich muβ Ihnen etwas sagen.
іх мус і:нэн этвас загэн.
Калі вы не разумееце, то спытайцеся.
Wenn Sie nicht verstehen, so fragen Sie!
вэн зі: ніхт фэрштэ:н, зо фрагэн зі:

«Весялінка» — дзіцячая старонка

Сігналы-сімвалы

Напэўна, у вас калі-небудзь узнікала пытанне, як людзі раней абыходзіліся без пісьма. Аказваецца, выкарыстоўвалі сігналы-сімвалы.

У кожнага народа ёсць свае сігналы-сімвалы. Яны абазначаюць тое ці іншае паняцце, штосьці забараняюць ці дазваляюць. Сігналы ў жыцці людзей маюць вялікае значэнне. У старажытных грэкаў нават была легенда пра трагедыю, якая адбылася з-за сігналу.

...Даўным-даўно на востраве Крыт жыло страшыдла, напалову чалавек, напалову бык. Звалі яго Мінатаўр. Кожныя дзесяць гадоў грэкі павінны былі пасылаць яму страшную даніну — сем юнакоў і сем дзяўчат, якіх ён з'ядаў. Ніхто не мог перамагчы Мінатаўра. І ніхто не мог ад яго выратавацца.

Жыў Мінатаўр у Лабірынце, у якім былі такія заблытаныя калідоры і пераходы, што выйсці з яго было немагчыма. (Цяпер слова *лабірынт* абазначае тое, у чым можна заблытацца, адкуль цяжка знайсці выхад).

Але знайшоўся мужны юнак па імені Тэсей, які вырашыў выратаваць людзей ад Мінатаўра. Ён падрыхтаваў карабель, каб адплыць на Крыт. На караблі былі розныя ветразі: адны чорныя, а другія белыя. Перад тым як адплыць на Крыт, Тэсей дамовіўся са сваім бацькам так: колер ветразяў, пад якімі карабель вернецца з плавання, будзе сігналам перамогі ці пагібелі (белы — перамогі, чорны — пагібелі).

І вось моцны, смелы і разумны Тэсей перамог Мінатаўра, удала выбраўся з Лабірынта і адправіўся ў зваротны шлях. Ён быў такі шчаслівы, што зусім забыўся пра дамову з бацькам, а той дзень пры дні стаяў ля берага, углядаючыся ў марскую далячынь. Нарэшце, шчаслівы Тэсей наблізіўся да родных берагоў. Але... яго карабель ішоў пад ветразямі, якія абазначалі паражэнне і пагібель. Убачыўшы здалёку карабель і колер яго ветразяў, бацька кінуўся са скалы ў мора і загінуў...

Падрыхтавала
Любоў ЛАМЕКА.



Аканне

(Працяг. Пачатак у № 9—10).

Наш славуты лінгвіст Я. Карскі вывучаў мову беларуска-літоўскіх летапісаў і назваў яе «очень чистым западнорусским языком XV—XVI столетий». Вучоны адзначыў важную рысу старабеларускай мовы: «В области гласных первое место в теперешних белорусских говорах и старом западнорусском занимает аканье». Я. Карскі падае шматлікія прыклады з «Летапісца Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага» ды з «Кронікі аб Вялікіх князях Літоўскіх»: «Рынкгалту, за Мазырем, караблех, з Навагородка, начовал, Витовтавы, стаяти, польтараста, манастырь, безавсякого, горазда». Апошнія тры, «иностранные», як бачым, таксама былі напісаны паводле беларускай традыцыі. Даследчык быў перакананы, што «случаи написания *о* на месте этимологически правильного *а*, как *у комноте* рядом с *у комнате*» сведчаць пра аканне пісца, які не адрозніваў ненаціскное *о* ад *а*. Выпадкаў з'яўлення *а* на месцы *е* ў даследаваных летапісах значна менш.

Я. Карскі заўважыў у «Летапісцы...» ды ў тэксце «Кронікі...» яшчэ адну асаблівасць нашай мовы — ужыванне *а* як злучніка замест *і*: «Прошка *а* Белик *а* Кучук *а* Лисица», «Корачова *а* Слоним». Падобныя прыклады Я. Карскі знайшоў не толькі ў летапісах, але і ў Статуце Вялікага княства Літоўскага і ў перакладзеных на беларускую мову творах мастацкай літаратуры («Александрыя» ды «Аповесць аб Трыстане»). Гэтая асаблівасць нашай мовы была вядома і аўтару «Слова пра паход Ігаравы», якое заканчваецца сказам: «Князю слава *а* дружыне». Злучнік *а* нясе тут больш значную эстэтычную нагрузку, чым верагодны злучнік *і*, і надае твору больш выразнае гучанне. Гэтую моўную з'яву, відаць, нельга назваць аканнем, але яна — яшчэ адно сведчанне вялікай ролі гука *а* ў беларускай мове.

(Працяг будзе).

Асцярожна: «пятая калона»!

Прачытаў у «Нашым слове» допіс Івана Патапейкі «Дзякую — дзеяслоў». Аўтар публікацыі амбіцыёзна сцвярджае: «Вельмі прыкра слухаць, калі... не абы ад каго, а з вуснаў адукаваных журналістаў гучыць недарэчнае... «Вялікі вам дзякуй!»

І далей Патапейка прыводзіць доказ, узяты, відаць, з арсенала людзей, невылечна хворых на нацрабства: «Можна параўнаць гэтае слова з расійскім (падкрэслена мною — А. Ю.) «спасибо», якое ўтварылася таксама ад дзеяслова загаднай формы «спаси Вас Бог».

І зусім не важна, што ў расійскае мове *благодарить* — к о г о? *его;* а ў беларускай *дзякаваць* — к а м у? *яму*. Галоўнае, каб як у «старшего брата», а гэтых жа «адукаваных журналістаў», каб не перашкаджалі «слиянию в великий и могучий», маўляў, лепей за ўсё ў ссылку!

Устрывожаны публікацыяй, патэлефанаваў старшыні Рэспубліканскай Рады ТБМ імя Ф. Скарыны Ніле Сымонавічу Гілевічу.

— Я перакананы, што трэба казаць «вялікі дзякуй». Той, хто кажа «вялікае», механічна пераносіць з рускай, а трэба арыентавацца на жывую мову,— адказаў паэт.

Навукова абгрунтаваўшы, пацвердзілі гэтую ж думку і выкладчыкі Белдзяржуніверсітэта Мікола Каваленка і Марыя Карповіч. І вялікі дзякуй «Нашай Ніве», «Звяздзе», «ЛіМу», усім сумленным «рыцарам пяра» за правільнае беларускае вымаўленне!

І ўсё ж такі не пакідае трывога ў дачыненні да «товарища» Патапейкі. Замест таго, каб выступіць як апаненту Адраджэння, ён заяўляе: «Відаць, некаму прыйшлося не даспадобы наша слова»...

Алег ЮШКЕВІЧ.

«Вялікі дзякуй»

Колькі разоў даводзілася чытаць і чуць, што выслоўе «вялікае дзякуй» з'яўляецца калькаваным перакладам-прыпадабненнем расійскага «большое спасибо». І вось «Наша слова», «давяршаючы» працэс разняволення выразу «вялікі дзякуй» ад ценю расійскага адпаведніка, друкуе допіс сп. Патапейкі. Друкуе без усялякага каментару, як, дарэчы, і «славутую» нататку пра «яечкі—марожанае».

Што ж, я мушу згадзіцца са сваім земляком, што слова «дзякую» папраўдзе — дзеяслоў. Але нельга ў пятлю дзеяслова сілком піхаць назоўнік «дзякуй», ды яшчэ ў дадатак загнаць гэтаму назоўніку ў «рот» кляп з (зноўку-такі) расійскамоўных прыкладаў.

Што да пісьменнасці выразу «вялікі дзякуй», то нават «Беларуска-рускі слоўнік» (1988 г., т. 1) аддае перавагу слову «вялікі», праўда, не забывае пры гэтым дадаць у дужках «вялікае».

«Вялікі дзякуй» — гэта чуем і ад нашых філолагаў і ад беларусаў замежжа, і ўспрымаем як належнае. А калі хтосьці з беларусаў, вяртаючыся да роднай мовы, усё яшчэ аглядаецца, а як у расійскай мове, я хацеў бы ім параіць часцей звяртацца да народнай, жывой мовы.

Віктар МАЛІНОЎСКІ.
г. Бабруйск.

А калі зазірнуць у спадчыну...

Францішак Скарына некалькі разоў выкарыстаў дзеяслоў *дзякаваць* у сваіх перакладах Бібліі. «Есть родъ... еже не дякуеть матери своеи» (Прытчы Саламонавы, 45б.), «молился и дяковалъ за таковое обещание Царь Давыдъ господу Богу» (Другая кніга «Царстваў», 77б.). «онъ лежа подъ одежею своею дяковалъ тобе» (Другі закон, 46б.).

А Іван Насовіч у слоўніку беларускай мовы «Словарь белорусского наречія», Санктпетербургъ, 1870) прывёў словы жывой народнай мовы: «Дзяковаць Богу за все. Дзяку тобе за гето, а за другое боли подзякую. Дзякуй вамъ за хлебъ-соль». Як бачым, у народнай мове назоўнік *дзякуй* ужываўся, відаць, здаўна.

Беларусы-філолагі

КАПЫЛЯНІН

Вершы Алеся Гурло (1892—1938) друкаваліся ў «Нашай ніве» з 1909 года. Зборнікі яго твораў выходзілі напрыканцы 30-х гадоў і пасля вайны. Ды з біяграфіі паэта была выкраслена яго навуковая дзейнасць. Сакратар тэрміналагічнай камісіі Інстытута беларускай культуры Алесь Гурло рыхтаваў да выдання вельмі патрэбныя ў той час слоўнікі, самастойна апрацаваў слоўнік «Тэхнічная тэрміналогія», у які ўвайшло 6818 тэрмінаў і словазлучэнняў. Гэтая першая ластаўка з'явілася ў 1932 годзе, калі пасля арышту паэт ужо быў сасланы ў Самару. Адтуль Алесю Гурло ўсё ж удалося вярнуцца ў Менск, дзе падчас арышту 4 лютага 1938 года ён раптоўна памёр.

З. С.

Кароткі слоўнік эканомікі

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ «ДЗІКАЯ». Вынаходніцтва не айчыннае, хоць радасці простаму люду ад таго мала. Адбываецца пры пераходзе ад аднаго сацыяльна-эканамічнага стану краіны ў іншы, калі дзяржаўнай маёмасцю бескантрольна распараджаецца вышэйшае чыноўніцтва. Вельмі трапна ахарактарызаваў гэтую з'яву ў сённяшняй Беларусі вядучы канструктар Менскага аўтазавода, народны дэпутат рэспублікі Мікалай Крыжаноўскі: «Вярхоўны Савет, у складзе якога большасць адданых прадстаўнікоў былой кампартыйнай наменклатуры, пакуль што не прыняў закона аб прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці і не ставіць механізма рэалізацыі пакуль што толькі дэкларатыўнага права прыватнай уласнасці на зямлю. У той час уся гэта наменклатура і звязаная з ёю мафія на падставе розных часовых падзаконных актаў спешна праводзіць гэтак званую дзікую прыватызацыю, адкрыта раскрадаючы створаную народам дзяржаўную ўласнасць... Ніхто з іх сёння не займаецца ні прамысловасцю, ні сельскай гаспадаркай».

Як сведчыць сусветная практыка, заканчваецца ўсё гэта ці стыхійным выбухам народных мас і рабаўніцтвам усяго і ўсіх, ці прыходам да ўлады новых палітычных сіл і прынялцем закона, якім ранейшая «дзікая» прыватызацыя ануліруецца і назначаецца крымінальнае следства. Так што будзе лепей, калі гэтую складаную справу ўсё ж зрабіць цывілізаванымі сродкамі, а не займацца тым, што народ трапна назваў «прыхватызацыяй».

Алег БЕМБЕЛЬ

З «падпольнай» кнігі

(Працяг. Пачатак у №№ 5—10).

...І ПАСЛЯ...

Па дарозе дадому я зайшоў у «Фота» — спытаць, ці гатовыя фотаздымкі маёй дачкі. Папрасіў прабачэння, што спазніўся...

— Ой, вы так хорошо говорите по-белорусски,— сказала мне маладзенькая дзяўчына, перабіраючы канверты са здымкамі.— Так прыятно вас слушать!..

— Няўжо?..

— Правда... Вы, наверное, в театре работаете?..

— Да-а... Сапраўды — жывы тэатр на сцэне беларускай сталіцы!.. Вы беларуска?..

— Нет, я недавно приехала... Из Московской области...

— А калі б у вас у Маскве спыталі: чаму гэта вы па-руску гаворыце?.. Вы, часам, не ў Малым тэатры працуеце?.. — Як бы вы рэагавалі на гэта?..

— А правда... Вот я в Киеве была... Остановки в автобусе объявляют по-украински. Я — ничего не понимаю... И пассажиры между собой как-то по-украински говорят...

— Няўжо?.. Што яны — звар'яцелі?! (Смяецца...).

— Вы таксама здалёк да нас прыехалі? — спытаў я ў яе напарніцы.

— Нет, я белоруска,— сказала яна, крыху засаромеўшыся.

— Нешта я не чую вашай беларускасці... Толькі бачу — прыгажосць вашу... (Пачырванела... маўчыць...).

— Усяго вам добрага, дзяўчаты!..

— Да пабачэння,— адказала з добрай усмешкай тая, што прыехала з Маскоўскай вобласці.

— Да пабачэння,— далучылася да яе прыгажунечка-беларусачка...

З ЛІСТА БЫЛОГА БЕЛАРУСА...

Развітаўшыся з дзяўчатамі, я ізноў — каторы ўжо раз! — вярнуўся ў думках сваіх у студзень 1977 года, калі адна жанчына паказала мне ліст з Масквы — ад свайго роднага брата. Ён дзяліўся з ёю сваімі ўражаннямі аб кнізе ўспамінаў пра вядомага беларускага паэта. У лісце шасцідзесяцігадовага беларуса, інжынера па прафесіі, які ўжо некалькі дзесяцігоддзяў жыў і працаваў у Маскве і толькі зрэдку прыязджаў у Мінск да сястры, быў фрагмент, які мяне моцна ўразіў, і я, з дазволу гаспадыні, перапісаў яго. Відаць, менавіта з гэтых радкоў і пачала складацца кніга «Што мы думаем пра цябе — беларуская мова?.. ».

Вось гэтыя радкі:

«...Второе моё замечание по поводу перевода на белорусский язык . За такой перевод я поставил бы переводчикам двойку. Мне, белорусу, читать эту книжку, написанную на родном языке, довольно трудно. Воображаю, как могут ее читать остальные. Ведь в наш век технического прогресса, массовой информации, укрепления международных связей, роста экономики, культуры, грамотности, социальных потрясений и, наконец, в силу географического положения Белоруссии сам по себе белорусский язык за последние годы сильно изменился, значительно сузилась область его применения. Белоруссия является наглядным примером сближения наций (русской и белорусской), о котором в свое время говорил Ленин. Сейчас всюду и везде, на конференциях, в деловой переписке, при издании научной, технической литературы и т. д. применяется русский, а не белорусский язык. Высокий уровень транспортных связей ликвидировал «медвежьи уголки», где сохранился белорусский язык, национальные традиции и т. д. Белорусский разговорный язык сейчас стал русско-белорусским. И вот в такой обстановке находятся мудрецы, которые выкапывают из глубины веков давно вышедшие из употребления слова или просто выдумывают новые и преподносят нам как развитый современный настоящий язык, мало кому понятный. Ведь народ не хочет такого языка, он предпочитает своих детей посылать не в белорусские, а в русские школы, покупать не белорусские, а русские газеты и т. д. Зачем же навязывать такой язык людям, который не помогает, а мешает росту культуры? Мы сейчас живем в такое время, когда русский язык стал изучаться в 70 странах мира, когда неизмерно вырос авторитет этого языка, нашей страны. Спрашивается, зачем становиться поперек жизни, чураться русского языка, тратить деньги, издавать книги, журналы на языке, мало известном широкому читателю?»

Беглі дні, тыдні... Фрагмент гэты ўсё не выходзіў з мае галавы...

Нічога прынцыпова новага — у параўнанні з тым, што я чуў аб гэтым раней,— тут не было: паасобку і з меншым запалам падобныя меркаванні даволі часта выказваюцца нашымі сучаснікамі. Але па спрасаванасці аргументаў і своеасаблівай глыбіннай эмацыянальнасці гэта было значна мацнейшым за ўсё папярэдняе...

Неяк сама сабой з'явілася думка — зрабіць невялічкую падборку тэкстаў: «Беларускія паэты — пра беларускую мову»...

Зрабіў. І разам з «лістом маскоўскага беларуса» пачаў паказваць яе людзям розных прафесій і пакаленняў, запытваць: што яны думаюць пра ўсё гэта?.. Іхнія ўражанні і думкі я запісваў. Некаторыя — самі мне нешта пісалі. І з гэтых запісаў атрымалася кніга, якая цяпер перад Вамі.

Вашы думкі аб гэтых тэкстах, паважаны чытач, аб тым, што ў іх,— я таксама буду чакаць з вялікай цікавасцю і ўдзячнасцю...

(Працяг будзе).

Адаму Багдановічу — 130!

Ірына КРЭНЬ

Мой тытул у Беларусі — «бацька паэта»



Адам Ягоравіч Багдановіч належаў да тых людзей, памяць аб якіх доўга зберагаецца ў народзе.

Нарадзіўся Адам Ягоравіч 20 сакавіка 1862 года ў мястэчку Халопенічы былога Барысаўскага павета (цяпер Крупскі раён). Яго бацька Ягор Лук'янавіч быў дваровым пана Лапы, працаваў у маёнтку кухарам. У час рэформы 1861 года ён не атрымаў зямельнага надзелу і быў вымушаны ў пошуках заробку пераязджаць з сям'ёй з месца на месца. Калі бацька траціў працу, сям'я вярталася ў Халопенічы да бабулі Рузалі Асьмак, вядомай казачніцы і варажбіткі, і жыла з таго, што даваў лапік зямлі памерам шаснаццаць на восемдзесят сажняў пры старэнькай хаце. Аднак паколькі бабуля Рузаля і маці Анэля былі выдатнымі гаспадынямі, хораша пралі і ткалі, то сям'я абдзёртай і галоднай не хадзіла. Адам Багдановіч прыгадваў, што яго маці валодала выключнымі матэматычнымі здольнасцямі (напрыклад, узводзіла ў 7 ступень) і была такая ж таленавітая апавядальніца, як і бабуля. У зімовыя вечары дзеці, седзячы на печы, слухалі казкі. Бабіна хата з яе казачнай атмасферай стала для Адама першай адукацыйнай школай, дзе задавальняліся яго разумовыя і эстэтычныя запатрабаванні. Спакваля казка выхоўвала ў яго любоў і спачуванне да простага чалавека, нянавісць да ўсялякага зла і несправядлівасці. Мінуць гады, і ён стане заўзятым збіральнікам фальклорнага багацця, накопіць велізарны матэрыял, апублікуе дзве кнігі па этнаграфіі. А ў канцы жыцця са скрухай прыгадае, што большасць з таго, што ён сабраў і запісаў, загінула незваротна: «Напісаў я, уласна, многа, каля ста ці нават больш друкаваных аркушаў, лічачы тое, што ў рукапісах. Гэта вельмі многа, калі ўзяць пад увагу, што я ніколі не займаўся адной справай, а дзвюма, трыма паралельнымі... Напісаў многа, а толку мала: усё гэта канула ў Лету правінцыяльных часовых выданняў, дзе іх і заўзяты бібліёграф не знойдзе. Адны толькі «Перажыткі» ды тое, што надрукавана ў зборніках Акадэміі навук, могуць мець дзейснае значэнне...» («Мае ўспаміны»).

У шэсць гадоў Адам Багдановіч пайшоў вучыцца ў халопеніцкую школу, дзе панавалі строгія парадкі: дзяцей секлі розгамі, ставілі на калені, білі «ў лапу». Вучыўся на славутых «Начатках хрысціянскага праваслаўнага навучання», як і Якуб Колас, вучыўся вельмі старанна, заслужыў славу лепшага вучня. З першага артыкула «Начаткаў» ён даведаўся, што яго бацькаўшчына Расія. А далей пайшло: Русь язычніцкая, Уладзімір — язычнік, хрышчэнне Русі і г. д. Адам Ягоравіч прыгадваў, што ён тады ўпершыню з гонарам асэнсаваў сваю прыналежнасць да Расійскай дзяржавы.

Вучыўся Адам у Халопенічах зімою, а ў астатнія поры года зарабляў капейкі на службе ў пана. У 1870 годзе яго бацька пераехаў з сям'ёй у Менск. Працаваў ён, як заўсёды, кухарам. Быў Ягор Лук'янавіч, па словах сына, «купаны ў гарачай вадзе», рэзкі і незалежны ў адносінах з людзьмі, меў цвёрдую руку і цвёрды характар. Напамін аб тым часе знаходзім у пісьме Вацлава Ластоўскага да Адама Багдановіча: «Памятаю Вашы словы на ганку ў Мінску. Вы паказалі на сад і сказалі: «Вось тут татка мой, дзякуй яму, мяне не раз сек розгамі». Мяне расчуліў Ваш сказ, і я заўсёды прыгадваю яго разам з Вамі. У гэтых простых словах было многа любві».

У Менску Адам паступіў у гарадское пачатковае вучылішча, у якім пазней ён быў загадчыкам або старшым настаўнікам. Школа працавала ў духу новых педагагічных ідэй. Вучыўся ён па «Роднаму слову» Ушынскага, кнізе, якую лічыў «жамчужынай педагагічнай навукі, адзінай і нікім не пераўзыдзенай».

Аднак бацька хутка страціў работу, і сям'я вярнулася ў бабіну хату.

Вясной 1876 года Багдановічы зноў пераязджаюць у Менск. На гэты раз бацька і маці вырашылі, што сын павінен стаць рамеснікам. Пацягнуліся доўгія месяцы катаржнай вывучкі ў розных майстроў, калі ён удосталь паспытаў долі «папіхача» — выконваў самую брудную і чорную работу. Грошай яму не плацілі, але затое моцна білі і здзекаваліся. Ён рваў абутак, адзенне, а дома так чакалі яго заробкаў. Па чарзе вучыўся ў паравозным дэпо на машыніста, затым на слесара, токара, кандытара. Апошняй прафесіяй авалодаў нядрэнна. Пасля цяжкай вучобы стаў чалавекам, які сам мог задаволіць свае патрэбы.

На шырокае поле грамадскай і навуковай дзейнасці вывелі Адама Багдановіча кнігі. У гэты самы невыносны для сябе час ён займаўся самаадукацыяй. Вось пералік аўтараў кніг, якія ён прачытаў, калі вучыўся ў майстэрнях: Міцкевіч, Сыракомля, Дзікенс, Сервантэс, Свіфт, Дэфо, Дзюма, Купер, а з рускай класікі — Пушкін, Гогаль, Тургенеў, Талстой, Грыгор'еў. Марыў прачытаць Шэкспіра, Шылера, Гётэ і Дантэ, але іх у бібліятэках не знайшоў. З цяжкасцю, не разумеючы сэнсу, адольваў Бялінскага і Дабралюбава. Паступова ў юнака выспеў намер вучыцца далей. І гэта пасля таго, як стаў ужо майстрам-кандытарам і яго будучыня была забяспечана. Цёмнай ноччу, патаемна ад усіх, Адам Багдановіч уцякае ад гаспадара-кандытара.

Увосень 1879 года паступае ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. У сваіх успамінах пра дарэвалюцыйнае мінулае Беларусі ён падрабязна апісвае Нясвіж і сваю вучобу ў сценах былой езуіцкай калегіі і манастыра, закрытых царскімі ўладамі пасля паўстання 1863 года.

У семінарыі Адам Багдановіч працягвае займацца самаадукацыяй: яго ўсур'ёз захапілі ідэі рускіх сацыял-дэмакратаў і тэорыя сацыялізму. Ён стварае гурток па вывучэнні палітычнай літаратуры. Чыталі ў ім Лаўрова (Міртава) «Гістарычныя пісьмы», Ласаля «Аб сутнасці канстытуцыі», Міля «Палітычную эканомію», Шэфэле «Аб сутнасці сацыялізму» і інш. Яшчэ ў семінарыі А. Багдановіч знаёміцца з вучнем Менскай духоўнай семінарыі А. Хлябцэвічам, які яго «звёў» з менскімі нарадавольцамі. Справе партыі «Народная Воля» Багдановіч аддаў пяць гадоў жыцця. Быў спярша радавым сябрам партыі, затым адным з яе кіраўнікоў.

Пасля заканчэння Нясвіжскай семінарыі А. Багдановіч акунуўся ў вір грамадскага жыцця. Працуе настаўнікам, займаецца зборам і друкаваннем фальклорных матэрыялаў, вядзе рэвалюцыйную прапаганду сярод настаўнікаў і вайскоўцаў. Сваю асветную і навуковую дзейнасць Адам Багдановіч аднак падпарадкоўвае палітычнай: лічыць, што яго найпершая задача дамагацца звяржэння самаўладства. У гэты час у патаемным месцы ён захоўвае літаратуру, якую выкарыстоўвае ў прапагандысцкіх гуртках: «Капітал» Маркса, замежныя выданні групы «Вызваленне працы», творы Ласаля, нумары «Народнай Волі» і нават падпольнае выданне беларускага часопіса «Гоман» (1884), у якім ставілася пытанне нацыянальнай аўтаноміі Беларусі і адраджэння дзяржаўнасці народа.

Палітычная дзейнасць А. Багдановіча праходзіла ў атмасферы вышуку, вобыскаў, арыштаў, што падарвала здароўе, і малады настаўнік захварэў на сухоты.

(Працяг будзе).



Рубрыку вядзе
Лявон БАРШЧЭЎСКІ

Пачатак росквіту еўрапейскай нецаркоўнай лірычнай паэзіі ў эпоху Сярэднявечча можна звязваць з творчасцю *трубадураў* (у Правансе) і *трувэраў* (у Цэнтральнай Францыі), якая дасканала выкарыстоўвала здабыткі антычнай, а ў пэўнай ступені і сярэднявечнай арабскай лірыкі, а таксама мясцовага фальклору. Ніжэй змяшчаюцца вершы трубадура Пэйрэ Відаля (каля 1175—1215) і трувэра Бландэля дэ Нэсля (XII стагоддзе, дакладныя гады жыцця невядомыя).

Пэйрэ ВІДАЛЬ

КАНСОНА

Поўнымі грудзьмі ўдыхаю
Правансальскі ветрык мілы,
Радасці прыліў і сілы
Незвычайнай адчуваю.
Я хацеў бы зноў і зноў
Шмат прыгожых, добрых слоў
Чуць пра край свой родны.

З двух бакоў абшары краю
Рона з Вэнсай затуліла,
З поўдня мора падступіла
І Дзюрэнс; я далятаю
Думкай да яго лугоў —
І надоўга знік, сышоў
Мой настрой маркотны.

Я і дня не пражываю,
Каб мяне не захапіла,
Каб душу не запаліла
Згадка пра яе; ўсхваляю
Донну, і палае кроў:
Прыгажэйшую знайшоў
Хто б сярод смяротных?

Таямніцы не хаваю:
То яна мяне натхніла,
Тыя песні акрыліла,
Што цяпер я вам спяваю.
Лепшых не знайсці дароў
За яе пагляд, любоў —
Гэтым жыць я згодны.

Пераклад з правансальскай
Лявона БАРШЧЭЎСКАГА.

БЛАНДЭЛЬ ДЭ НЭСЛЬ

* * *

З прыходам вясны
Гэтак сэрца пяе:
Збыліся яны —
Мроі-думкі мае.
Я так бы не змог
Пяяць сэрцам сваім,
Каб мне не даў Бог
Столькі радасці ў ім!

Каханкам любоў
Шчасце-ўцеху дае,
Найлепшых дароў
Справядлівым стае,
Шляхетнасць манер —
Скарб каштоўны ў людзях:
Трэба йсці ўсім цяпер
Па трох гэтых шляхах.

Пераклад з старафранцузскай
Лявона
БАРШЧЭЎСКАГА.

Проза

(Працяг. Пачатак у №№ 5—10)

Гары КЕМЕЛМАН

З. ВЕРАГОДНАСЦЬ ПРОЙГРЫШУ

— Але ў гэтую сераду было крыху інакш,— сказаў Эдвардс.— Нейкая работа затрымала Ольбрэхта ў лабараторыі, і потым ён адзін пайшоў да Макнальці. Ва ўсякім разе, тым вечарам яны гулялі ў шахматы. Вы памятаеце, як стаіць мэбля ў хатнім кабінеце Макнальці? Вось, зірніце яшчэ раз.— Палкоўнік адкрыў свой партфель і выняў адтуль фотаздымак кабінета забітага прафесара: пакой скрозь устаўлены кнігамі, з праёмам у выглядзе аркі — выхадам у калідор; амаль пасярэдзіне, направа ад аркі,— шахматны столік. Здымак быў зроблены з узроўню століка, і выразна былі відаць шахматная дошка і фігуры — збітыя чорныя і белыя ляжалі ўперамешку па адзін бок дошкі.

Эдвардс паказаў на крэсла, што стаяла ля століка

— Тут сядзеў Ольбрэхт — тварам да аркі, што вядзе ў калідор. Прыхожая і парадны ўваход — па калідоры налева, гэта значыць, улева ад таго месца, дзе сядзеў Ольбрэхт. Як ён расказвае, у самы разгар гульні Макнальці пайшоў адчыняць дзверы. Раптам Ольбрэхт пачуў пісталетны стрэл — гэта ён потым зразумеў, а спачатку зблытаў з гукам выхлапу глушыцеля праезджай машыны. І зразумела, бо факты гавораць, што дула пісталета было шчыльна прыціснута да грудзей Макнальці. Гук стрэлу ў такіх выпадках, як вядома, прыглушаны, быццам страляюць у падушку. Як бы там ні было, Ольбрэхт пачакаў некалькі хвілін, а потым паклікаў гаспадара. Не пачуўшы адказу, ён пайшоў у прыхожую і знайшоў свайго друга мёртвым на падлозе ля самых дзвярэй з ранай у вобласці сэрца і цёплым яшчэ пісталетам у руцэ. І тады ён пазваніў у паліцыю. Ці не так расказваў Ольбрэхт? Можа, я што-небудзь выпусціў?

Я адмоўна патрос галавой, сілячыся здагадацца, куды гне палкоўнік.

Эдвардс задаволена ўсміхнуўся і зноў загаварыў:

— Зусім натуральна, што на падставе гэтага сведчання мы адхілілі версію самагубства. Мы дапусцілі, што яго застрэліў чалавек, які пазваніў. Падумаўшы, што Макнальці быў дома адзін, ён усунуў зброю ў руку сваёй ахвяры, каб надаць забойству выгляд самагубства. Калі званок сапраўды звінеў, магло быць толькі забойства, а не самагубства. Таму што, калі нават той, хто званіў, быў проста нетутэйшы чалавек, які пытаўся, скажам, як прайсці на чыгуначную станцыю, пра самагубства не можа быць і гаворкі, бо ў такім разе яно павінна было адбыцца на яго вачах. Дзверы шкляныя, і нават калі б ён адразу збег адтуль, ён каму-небудзь расказаў бы, і нам стала б вядома. А яшчэ выходзіла б, што ўвесь час, пакуль Макнальці гуляў з Ольбрэхтам у шахматы, ён хаваў у кішэні зараджаны «люгер». Выходзіла б, што...

— Добра,— перабіў я палкоўніка,— версія самагубства адпадае. Што ж вымусіла вас зноў да яе вярнуцца?

Эдвардс узлаваўся, што я перабіў яго, але адразу ж схамянуўся і авалодаў сабой.

— Дзвярны званок! — пераможна ўсклікнуў ён.— У расказе Ольбрэхта адна дэталь не зусім добра стасуецца да астатніх. Я папрасіў яго пераказаць гэты момант некалькі разоў, і, нарэшце, увагу маю прыкавала тое, што ён ніводнага разу не сказаў, што чуў, як звінеў званок, а толькі, што Макнальці папрасіў у яго прабачэння і пайшоў да дзвярэй, сказаўшы, што нехта прыйшоў. Калі я адкрыта спытаўся ў яго, ці чуў ён званок, Ольбрэхт крыху сумеўся і, нарэшце, заявіў, што не чуў. Ён тлумачыць гэта тым, што цалкам аддаўся гульні, але я праверыў — званок у Макнальці гучны, і, каб ён звінеў, Ольбрэхт абавязкова пачуў бы.— Эдвардс пацізнуў плячамі.— Бясспрэчна адно: калі ля дзвярэй не было трэцяй асобы, версія самагубства зноў выплывае наверх.

Палкоўнік змоўк. Потым, крыху пачырванеўшы, канфідэнцыяльна сказаў:

— Я быў не зусім з вамі шчыры і вымусіў вас думаць, што я накіраваўся сюды толькі з мэтай расследавання прычын і акалічнасцей смерці Макнальці. На самай справе я прыехаў яшчэ ранiцой таго дня і па тэлефоне дамовіўся з Макнальці сустрэцца ў яго доме а палове дзевятай вечара. Ведаеце, навуковы праект, распрацоўкай якога займаліся Макнальці з Ольбрэхтам, пасоўваўся наперад не вельмі паспяхова. Часта іх спасцiглі няўдачы. Выйшаў са строю тонкі апарат, на замену якога пайшло б некалькі тыдняў, а то і месяцаў. Справаздачы прысылаліся са спазненнем, у іх часта выяўляліся памылкі. Артылерыйскае ведамства, якое нясе адказнасць за праект, папрасіла нас праверыць іх работу, і мяне камандзіравалі сюды для папярэдняга расследавання. І вось цяпер, маючы на ўвазе верагоднасць самагубства, я спытаўся ў Ольбрэхта, ці можна дапусціць магчымасць сабатажу пры распрацоўцы праекта. І тут усё адкрылася. Ён прызнаўся, што апошні час пачаў падазраваць свайго друга і сёе-тое праверыў. Хоць Ольбрэхт амаль пераканаўся, што Макнальці вінаваты, ён не адважыўся адкрыта сказаць яму гэта. Але час ад часу рабіў намёкі. У той дзень у часе гульні ў шахматы ён намякаў, што ведае, што задумаў Макнальці. Як я зразумеў, ён вуаліраваў свае намёкі выразамі, прынятымі ў шахматыстаў. Сам я ў шахматы не гуляю, але ўяўляю сабе, што ён гаварыў нешта накшталт таго: «Гэты варыянт для вас вельмі небяспечны» — ну, што-небудзь падобнае. Праз нейкі час Макнальці, напэўна, зразумеў і страшэнна ўстрывожыўся. Ольбрэхт расказвае, што Макнальці пачаў мармытаць сабе пад нос: «Што ж мне рабіць?» Тады Ольбрэхт, зрабіўшы ход, прапанаваў яму: «Здавайцеся!» — што, як я разумею, на шахматнай мове азначае: «Прызнайце сваё паражэнне і канчайце».— Эдвардс склаў рукі так, нібы паднёс нам канчатковае рашэнне ў прыгожай упакоўцы: —І менавіта тады Макнальці сказаў, што хтосьці прыйшоў, і падняўся з-за століка.

— Ольбрэхт сам бачыў, як ён застрэліўся? — спытаўся я.

— Не. Бачыў толькі, як Макнальці пайшоў праз арку. Цяпер Ольбрэхт дадае адну падрабязнасць: замест таго, каб накіравацца налева, у прыхожую, Макнальці збочыў управа, дзе ў яго спальня. Напэўна, пайшоў узяць пісталет. Потым вярнуўся і прайшоў міма аркі ў прыхожую.

— Чаму ж ён не пачакаў, пакуль ад яго пойдзе Ольбрэхт?

— Мяркую, таму, што ведаў: я хутка прыйду. У мяне амаль не засталося ніякага сумнення, што Эдвардс знайшоў правільнае рашэнне. Але не хацелася прызнаваць гэтага. Больш ужо не засталося шанцаў пакласці Эдвардса на лапаткі. Мае думкі скіраваліся на Макнальці. Ён не быў маім прыяцелем, але я не раз гуляў з ім у шахматы ва універсітэцкім клубе. Асаблівай прыхільнасці я да яго не адчуваў, аднак мне неяк не хацелася верыць, што ён скончыў жыццё самагубствам, а значыць, сумленне ў яго нячыстае. Здаецца, мае пачуцці і сумленні адбіліся на маім твары, хоць я і спрабаваў іх схаваць.

— І гэта ваша канчатковая версія? — нарэшце спытаўся я пагардліва.— Дык жа першакурснік юрыдычнага факультэта разаб'е яе ўшчэнт! У ёй больш дзірак, чым у рэшаце!

Твар палкоўніка зрабіўся барвовым: яго ашаламіў мой ваяўнічы тон.

— Напрыклад? — прамовіў ён.

— Напрыклад, пісталет. Вы прасачылі, як ён трапіў да яго? А яшчэ: чаму Ольбрэхт спачатку гаварыў іншае? Чаму Макнальці выбраў для самагубства прыхожую? Навошта чалавеку, у доме якога мноства пакояў, страляцца менавіта ў прыхожай?

— Ольбрэхт адразу не ўсё сказаў, таму што Макнальці быў яго другам,— адпарыраваў Эдвардс. — Макнальці больш ужо не мог уплываць на ход распрацоўкі праекта, навошта ж Ольбрэхту расказваць, што гэта было самагубства, і дыскрэдытаваць Макнальці? Акрамя таго, ён, відаць, адчувае сябе крыху вінаватым у смерці прафесара. Памятаеце, прапанаваў яму здацца? Думаю, Ольбрэхт вельмі засмуціўся, калі друг яго пакончыў з сабой.

— А пісталет?

Эдвардс пацізнуў плячамі:

— Вы ж самі зазначылі, што гэта ваенны трафей. У краіне поўна іх, і вельмі нямногія зарэгістраваны. Хто-небудзь з былых яго студэнтаў мог падараваць яму. Дарэчы, Ольбрэхт прызнаў, што некалькі месяцаў назад Макнальці нешта такое яму гаварыў. Не, пісталет мяне не турбуе. А вось прыхожая сапраўды крыху бянтэжыла, пакуль я не агледзеў уважліва дом. Пасля смерці жонкі (яна памерла некалькі гадоў назад) Макнальці зачыніў верхні паверх дома і частку ніжняга. Таму, хаця ў доме шэсць пакояў, ён жыў фактычна ў маленькай кватэрцы на першым паверсе, што складалася з кабінета, дзе раней была сталовая, спальні і кухні. У кабінеце ён застрэліцца не мог — там сядзеў Ольбрэхт, які перашкодзіў бы яму. Кухня — сумежная з кабінетам, і, я думаю, Макнальці не хацеў зноў паказвацца Ольбрэхту. А вось спальня магла быць самым зручным месцам, каб не адна дэталь: там вісіць вялікі партрэт яго жонкі. Партрэт намаляваны анфас. Вось мне і прыйшло ў галаву, што менавіта гэта ўтрымала яго ад самагубства ў спальні — пад упартым позіркам нябожчыцы-жонкі. Вядома, гэта толькі дапушчэнне,— дадаў Эдвардс з самазадаволенай ухмылкай.

— Версія даволі слушная,— пагадзіўся я нехаця,— але толькі версія. У вас няма доказаў самагубства.

— Праўду кажучы — ёсць,— прамовіў ён няспешна, і каварная ўсмешка зайграла ў кутках яго рота.— У мяне ёсць доказы, якія падмацоўваюць маю версію, надзейныя доказы. Мы, ваенныя, людзі скрупулёзныя, а некаторыя з нас маюць сякі-такі вопыт. Ведаеце, я зрабіў парафінавую пробу на трупе Макнальці — вынікі станоўчыя.

Я павінен быў загадзя ведаць, што палкоўнік увесь час трымае ў рукаве галоўны козыр. Гэты раз я нават не паспрабаваў схаваць сваё расчараванне. Плечы мае апусціліся, і я паволі паківаў галавой у знак згоды.

— А што такое парафінавая проба? — раптам падаў голас Нікі Уэлт, які ўвесь час моўчкі слухаў.

— Яна іграе рашаючую ролю, прафесар,— адказаў я.— Не ўпэўнены, што дакладна ведаю яе хімічную механіку, але... Разумееце, Нікі, кожная агнястрэльная зброя (няважна, як шчыльна закрываецца яе затвор) выкідвае пры стрэле пэўную колькасць зараду ў адваротным напрамку. Частка пораху адлятае назад і ўразаецца ў руку таго, хто страляў. Пры расследаванні падобных выпадкаў руку абмазваюць расплаўленым парафінам, а потым, калі ён застыне, сцягваюць, як пальчатку. Далей робіцца аналіз адносна наяўнасці слядоў пораху — нітратаў, і, калі рэакцыя станоўчая, значыць, той чалавек страляў. Здаецца, на гэтым справа Макнальці завяршана.

— Значыць, галоўнае слова належыць аракулу з прабіркі? — іранічна спытаўся прафесар.

(Працяг будзе).

Але!

Адмовіліся ад сваіх выданняў

25 лютага адбыўся II пленум ЦК Саюза моладзі Беларусі, на якім большасцю галасоў прынята рашэнне адмовіцца з-за фінансавых праблем ад права быць заснавальнікамі часопісаў «Маладосць», «Крыніца» («Родник»), «Бярозка», «Вясёлка», газеты «Знамя юности». ЦК СМБ плануе ў хуткім часе пазбавіцца і ад «Чырвонай змены», «Піянера Беларусі» і «Зорькі». І не дзіўна, што калектывы гэтых выданняў, кінутыя на волю лёсу, пачалі шукаць выйсця з сітуацыі, у якой апынуліся. Так, 27 лютага ў Доме літаратара прайшоў «круглы стол» часопіса «Маладосць», на які былі запрошаны ўсе пісьменнікі, што жывуць у Менску. Сабралася крыху больш за дваццаць чалавек і, як ні дзіўна, сярод іх толькі чатыры маладыя літаратары. На гэта звярнуў увагу ў сваім выступленні старшыня Рады СП Беларусі Васіль Зуёнак, які сказаў: «Настаўнікі прыйшлі, а дзе вучні?» І сапраўды: няўжо маладых літаратараў не хвалюе лёс часопіса, які для многіх з іх даў пуцёўку ў вялікую літаратуру?

Галоўны рэдактар «Маладосці» Генрых Далідовіч расказаў пра цяжкасці з выданнем часопіса, пра «Бібліятэчку «Маладосці», у якой за час яе існавання выйшла 43 кніжкі маладых аўтараў. Клопатам пра часопіс былі напоўнены выступленні пісьменнікаў Петруся Макаля, Казіміра Камейшы, Алеся Пісьмянкова, Любы Тарасюк, Алеся Емяльянава і іншых.

Гэтым жа вечарам на беларускім тэлебачанні ў праграме «Крок» прымаў удзел першы сакратар ЦК СМБ Аляксандр Фядута. Зразумела, што гэта ніякая не падзея, але я ўпершыню ўбачыў і пачуў (спадар Фядута размаўляў па-расійску) важака нашай моладзі і адразу зразумеў, што хоць і няма камсамола, але яшчэ ёсць верныя ленінцы, якіх мала хвалюе лёс маладзёжных выданняў і беларуская мова.

В. ШНІП.

ФАКТЫ СЁННЯШНЯГА ДНЯ

Заканчваецца работа па перадачы архіва былога ЦК КПБ Галоўнага архіўнаму ўпраўленню пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Прынята больш за шэсць тысяч асабістых спраў партыйных і наменклатурных работнікаў. Матэрыялы гэтага партархіва ахопліваюць перыяд з 1987 па 1991 гады. Пасля афармлення ўсе дакументы будуць рассакрэчаны і адкрыты для даследчыкаў.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Спецыялісты Галоўнага архіўнага ўпраўлення Ніна Антонаўна Аўчыннікава (злева) і Эма Мікалаеўна Давыдава заканчваюць прыём спраў партархіва. 2. Сакрэтны партыйны бюджэт стаў даступным для даследчыкаў.

Фота Юрыя ПАЎЛАВА.

(БелТА).

ПАРТИЙНЫЙ БЮ...
Белорусской ...
на 1987 г...

ПАРТИЙНЫЙ БЮДЖЕТ
Белорусской парторганизации
на 1990 год



Да ўвагі замежных падпісчыкаў

Вырашана пытанне з падпіскай на газету «Наша слова» ў Паўночнай Амерыцы. Усе, хто жадае падпісацца, могуць зрабіць гэта праз рэдакцыю часопіса «Полацак» у Кліўлендзе. Кошт падпіскі на 1992 год — 24 долары ЗША. Можна атрымаць усе нумары за 1992 год, пачынаючы з першага.

КОЛЬКАСЦЬ ПАДПІСЧЫКАЎ «НАШАГА СЛОВА» РАСЦЕ

Больш за 200 падпісчыкаў нашай газеты дабавілася ў сакавіку гэтага года. Такім чынам, агульны наклад «Нашага слова» складае цяпер 7588 паасобнікаў. У студзені было 7340.

ДА СУАЙЧЫННІКАЎ ЗА МЕЖАМІ БЕЛАРУСІ

Дарагія беларусы ўсіх краёў! Без вашых допісаў «Наша слова» не здолее расказаць пра тое, чым жывяце вы далёка ад роднай Беларусі. Без нашай газеты вы не даведаецеся шмат чаго пра Адраджэнне на Бацькаўшчыне.

Просім адгукнуцца ўсіх тых, хто хацеў бы сёлета атрымліваць «Наша слова», а таксама дасылаць нам артыкулы, інфармацыю, фотаздымкі.



ХІМІЧНЫ САСТАЎ ПЧАЛІНАГА МЕДУ І ЯГО ЎЛАСЦІВАСЦІ

Пчаліны мёд мае выгляд густой, празрыстай, злёгку афарбаванай духмянай вадкасці. Хімічны састаў у розных гатунках мёду розны і залежыць ад раслін, з якіх сабраны нектар, ад глебавых і кліматычных умоў. У спелы кветкавы мёд уваходзіць 40 % пладовага цукру (фруктозы), 35 % вінаграднага цукру (глюкозы), 5—10 % сахарозы, вітаміны групы B, C, E, K, H, карацін, мінеральныя рэчывы (солі кальцыю, натрыю, магнію, жалеза, ёду, серы, хлору, фосфару, а часам і радыю), мікраэлементы, г. зн. элементы, якіх у арганізме чалавека знаходзіцца мізэрная колькасць (медзь, марганец, крэмній, алюміній, бор, хром, нікель, волава, цынк і інш.), арганічныя кіслоты (яблычная, вінная, лімонная, малочная, шчаўевая), амінакіслоты, бялковыя рэчывы (пратэіны), ферменты (энзімы) — рэчывы, якія паскараюць усе працэсы абмену рэчываў у арганізме, антыбіётыкі, гармоны, духмяныя рэчывы, пылок. Усяго ў мёд уваходзіць больш за 70 важных для арганізма ферментаў і рэчываў.

Навуковая літаратура называе наступныя лекавыя ўласцівасці мёду: 1) імуналагічную. Уласцівасць павышаць імунітэт і засцерагальныя сілы арганізма, яго ўстойлівасць супраць розных захворванняў, што садзейнічае падаўжэнню жыцця чалавека; 2) супрацьмікробную, або антыбактэрыялагічную. Уласцівасць забіваць бактэрыі ўзбуджальнікаў брушнога тыфу, паратыту, дызентэрыі, кішачных паразітаў (глістоў), сібірскай язвы, што тлумачыцца наяўнасцю ў мёдзе асобных рэчываў — фітанцыдаў расліннага паходжання, якія трапляюць у нектар і пылок. У працэсе захоўвання мёд не траціць гэту ўласцівасць; 3) супрацьзапаленчую, узнаўленчую. Уласцівасць рэгенерываць і аднаўляць пашкоджаныя клеткі і тканкі, абеззаражваць асяроддзе, дзякуючы чаму мёд спрадвеку выкарыстоўвалі для лячэння ран, скурных захворванняў, запаленчых працэсаў у роце і горле, а таксама для кансервавання раслінных і жывёльных прадуктаў. Старажытныя людзі пры дапамозе мёду бальзамавалі нябожчыкаў; 4) супрацьалергічную. Уласцівасць лячыць алергічныя захворванні. Алергія — стан паніжанай устойлівасці арганізма да некаторых рэчываў, не шкодных для большасці людзей. Яна можа выяўляцца пры спадчыннай схільнасці або калі ўжываць мёд нашча вялікімі дозамі ў цёплае сонечнае надвор'е. Лячэнне алергіі мёдам распрацавана клінічным спосабам. Трэба, аднак, памятаць, што мёд сам складаны алерген і выклікае алергічныя захворванні ў 8 % людзей; 5) супрацьцыстычную. Уласцівасць забіваць аднаклетачныя арганізмы жывёльнага паходжання (амёбы, інфузорыі і інш.), некаторыя з якіх няшкодныя, а іншыя выклікаюць сур'ёзныя захворванні ў чалавека.

Трэба памятаць, што мёд траціць многія лячэбныя ўласцівасці пры награванні да 60 °C. Тады ў ім разбураюцца ферменты, выпароўваюцца супрацьмікробныя і эфірныя рэчывы, утвараюцца розныя шкодныя элементы. Па сутнасці, ён ператвараецца ў сумесь цукраў або штучны мёд.

Алесь МАСАРЭНКА

Шпількі

— Там зёмнае месца, бульба ажно чорная ад зёму, бальшэнная.
(Зём— торф).

* * *

На буркатлівых жонак:
— Усе яны, качэргі, аднолькавыя: здаў зарплату — і тут жа ласкавее...

* * *

— Стаіць і мыліцца, чакае, пакуль яму будзе пастаўлена бутэлька.

* * *

— У мяне галаснік пераціснуты... Гэта ўсё ён, мужанёк мой. Трэба ж, браўся задушыць па п'янцы. З тых пор я і кадэхаю (кашляю), быдта пасля астуды, нейкі пяюн хрыпаты свішча ў глотцы.

* * *

— Ат, куды ўжо мне — і на ногі села, і на рукі.

* * *

— Ад людскога судаўя не ўберажэшся: аднаму дагадзіш, другому, а трэці, як ты яму ні ладзь, усё роўна асудзіць.

* * *

— Махнед нейкі ў яе цяпер.— Ці — Махмед... Не скажу правільна.

* * *

На жанчыну, у якой мужы паміраюць:
— Не баба, а мужычая смерць.

* * *

— А што яна?.. Усё шчэ ўпаражнях ходзіць, хоць каторы ўжо год сямейна жыве.

* * *

— Ён па мнісціі дамоў цярнуўся — усяго, што далі яму, не адбыў.

* * *

— Ат, бэцы гэтыя нагавораць, толькі слухай.

* * *

Пра сэрца:
— Ты яго, сынок, адурыў таблеткамі.

* * *

— Сена маё забралі, а мне дайжа на руку не ўсплюнулі.
(Не заплацілі за сена, задарма ўзялі).

* * *

— Ён барўздаўся ў пралабцы, прасіў помач... Ніхто не кінуўся ў ваду ледзяную, затануў хлопчык.

* * *

— Рабілі яны ў яго за чаядай.
(Адно харчаваліся, грошай не бралі).

* * *

— Хоць круком яго назаві, хоць вешалкай, а ён і сёння радавым не будзе... Ён у камандзірах прывык хадзіць за час парцейства, з сумкай на баку. Як жа — рабіць рукамі нічога не ўмее, а ўсё языком трубіць ды лапоча.

Наш адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13.
Тэлефон рэдакцыі: 33-17-83.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара неабавязкова можа адпавядаць меркаванню рэдакцыі.

Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

МВПА імя Якуба Коласа.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка».
Наклад 7588 паасобнікаў. Зак. 1169. Індэкс 63865.